Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 ЛЮТАГА 2008 г. ЧАЦВЕР

№ 24 (26137)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стальмашонка з 80-годдзем

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стальмашонка з 80-годдзем.**

У віншаванні, у прыватнасці, гаворыцца: «За больш як паўстагоддзе няспыннай і плённай працы вы ўпісалі нямала яркіх старонак у гісторыю беларускай культуры. Створаныя вамі маштабныя роспісы, вітражы і пано ўпрыгожваюць станцыі метро і грамадскія будынкі ў Беларусі і за мяжой, цудоўныя жывапісныя і графічныя работы ўяўляюць сабой сапраўдны мастацкі летапіс гісторыі Айчыны ў падзеях і асобах». «Няхай ваша майстэрства і ў далейшым прыносіць радасць людзям і служыць прыкладам для маладых мастакоў», — пажадаў Прэзідэнт юбіляру.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## За неаплату летась выселены 304 сям'і

**У Беларусі ў 2007 годзе былі пададзены заявы на высяленне 663 сем'яў за неаплату жыллёва-камунальных паслуг, 304 сям'і былі выселены. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь Ляпуноў.**

«Згодна з нашым заканадаўствам такія сем'і высяляюцца ў іншае, менш добраўпарадкавае жыллё. Гэта можа быць, напрыклад, інтэрнат, жыллё рэзервовага фонду», — адзначыў Генадзь Ляпуноў. Ёсць выпадкі, калі жыхары высяляюцца і ў сувязі з парушэннем правілаў утрымання жылога фонду, якое можа прывесці да яго разбурэння. «У такіх выпадках жыхары могуць высяляцца без прадастаўлення іншага жылля. У 2007 годзе так былі выселены 162 сям'і». Запазычанасць беларусаў за жыллёва-камунальныя паслугі ў 2007 годзе склала Br37,5 млрд. Гэта на 6,2 працэнта менш за ўзровень 2006 года. У 2007 годзе даўжнікам было накіравана 397 тыс. папярэджанняў, а таксама 45 тыс. іскавых заяў у суд на суму амаль Br25 млрд. Частка запазычанасці па пратэрмінаваных асабовых рахунках была пагашана ўжо ў працэсе суда.

**БЕЛТА.**

### ЖЫВІЎСЯ ЗА КОШТ «СПАЖЫЎСАЮЗАЎСКАГА» КРЭСЛА

**Намеснік старшыні праўлення Віцебскага абласнога саюза спажывецкіх таварыстваў пераўтварыў сваю пасаду ў крыніцу карупцыйных прыбыткаў.**

Паводле звестак прэс-цэнтра Генеральнай пракуратуры краіны, памянёная асоба атрымала ад індывідуальнага прадпрымальніка хабар у памеры 1300 долараў за прадастаўленне памяшкання без заключэння дагавора арэнды. Гэты ж кіраўнік актыўна выконваў і пасрэдніцкія карупцыйныя функцыі. У прыватнасці, ён падбухторваў камерсанта даць хабар у памеры 6000 долараў нейкім службовым асобам, якія павінны былі вырашыць праблемы бізнэсмена. Насамрэч, ён і не збіраўся з кімсьці дзяліцца хабарнымі грашыма. Больш за тое, як высветліла следства, аднойчы ён ужо прысвоіў 2000 долараў, якія, паводле яго слоў, былі прызначаны для подкупу іншых службовых асобаў. Яшчэ адну карупцыйную здзелку нядобрасумленны намеснік не паспеў ажыццявіць. Паводле звестак Генпракуратуры, за дапамогу асобам, якія хацелі набыць былы адміністрацыйны будынак Віцебскага райспажыўсаюза ў пасёлку Прыгарадным, ён патрабаваў хабар у памеры 4000 долараў.

Нядаўна адбыўся суд над карупцыянерам. За ўвесь «букет» памянёных злачынстваў ён атрымаў 6 гадоў і 6 месяцаў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### БЕЛАРУС ХАВАЎСЯ Ў ЛІВАНЕ

**Больш за 10 гадоў вясковец хаваўся за мяжой.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алег Слепчанка, у аўторак нацыянальным цэнтральным бюро Інтэрпола ў Рэспубліцы Беларусь завершаны працэс экстрадыцыі з Лівана гэтага беларуса, які адшукваўся Кобрынскім РАУС па абвінавачанні ў нанясенні цяжкіх цялесных пашкоджанняў аднавяскоўцу. У 1997 годзе ён два разы стрэліў з газавага пісталета ў галаву пацярпеламу, які страціў зрок левага вока. Зламыснік быў прыгавораны да 8 гадоў пазбаўлення волі, аднак знік.

**Ігар ГРЫШЫН.**

**ОАО «Борисовское СМУ» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион**

по продаже бетонно-растворного узла (общ. пл. 706 кв.м) и устройства для выгрузки цемента, расположенных: г. Борисов, ул. Демина, 13. Площадь земельного участка — 0,2341 га. Начальная цена 161 660 000 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект должна быть произведена в течение 7 рабочих дней после окончания торгов. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 26.02.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион**

по продаже обращенной в доход государства производственной базы 1991 года постройки со всеми коммуникациями, расположенной в д. Дубеи Солигорского района (вдоль трассы Минск—Микашевичи) на земельном участке пл. 7,8961 га, в составе: здание котельной, об. пл. 1297,2 кв.м; теплая стоянка, 686,5 кв.м; здание материально-технического склада, 483,3 кв.м; здание мастерской, 1794 кв.м; склад нефтепродуктов, 109 кв.м; стоянка на 24 сельхозмашины, 1275,7 кв.м; профилакторий для автомобилей, 1348,2 кв.м; контрольно-пропускной пункт, 48,1 кв.м; здание наружной мойки, 771,7 кв.м; административно-бытовой корпус, 1024,6 кв.м и др. Начальная цена — 3 376 490 210 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06 июня 2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 04 марта 2008 г. в 15.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, актовый зал. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 03 марта 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» 19.02.2008 г. проводит открытый аукцион**



по продаже здания комплекса бытовых услуг, об. пл. 1638,8 кв.м, расположенного: г. Заславль, ул. Советская, д. 100а. Площадь зем. участка 0,1607 га. Начальная цена — 2 664 000 000 бел. рублей с НДС.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015





## «Суканне» свечак на Грамніцы

**Бацькі і дзяды Фёдара МУРАВЕЙКІ з хутара Карчаватка Жыткавіцкага раёна свечкі «каталі» і «выкатвалі». А Фёдар Уладзіміравіч цяпер іх адлівае. Як сапраўдны пчаляр, ён выкарыстоўвае таксама чысты пчаліны воск і робіць «жывец» (кнот) з паклі. Да праваслаўнага свята Стрэчання (па народнаму Грамніцы) Фёдар Муравейка адліў (па мясцоваму, «ссукаў») свечкі для многіх жыхароў вёскі Грычынавічы.**

Уладзімір РУСАКЕВІЧ:

## «МІНСКАЯ ВЫСТАВА ЗАЙМАЕ АДНО З ВЯДУЧЫХ МЕСЦАЎ У ШЭРАГУ НАЙБУЙНЕЙШЫХ МІЖНАРОДНЫХ КНІЖНЫХ ВЫСТАЎ СВЕТУ»

**Учора пачала працу XV Мінская міжнародная выстава-кірмаш «Кнігі Беларусі-2008». Сёлета ў выставе бяруць удзел два дзесяткі краін. Ганаровым госцем стаў Ізраіль.**

Міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч адзначыў падчас адкрыцця выставы, што яна «правамерна займае адно з вядучых месцаў у шэрагу найбуйнейшых міжнародных кніжных выстаў. Франкфурта, Масквы, Кіева, Белграда, Варшавы, Вільнюса. У гэтай выставе бяруць удзел больш за 600 экспанентаў з 20 краін. Для нас вялікі гонар прымаць такую колькасць тых, хто працуе над стварэннем Яе Вялікасці Кнігі».



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Уладзімір Русакевіч дадаў, што падчас выставы будуць арганізаваны масавыя прэзентацыі, творчыя конкурсы, сустрэчы з аўтарамі. «Мы разлічваем, што карысць ад выставы будзе мець кожны з яе ўдзельнікаў. А культура Беларусі праз зносіны з вядучымі выдавецтвамі свету падымецца на больш высокі ўзровень».

Пасол Ізраіля ў Беларусі Зэеў Бен-Ар'е заявіў у сваім выступленні, што на стэндзе яго краіны прадстаўлена больш за 1 тыс. выданняў. Гэта кнігі выдавецтваў Ізраіля, а таксама яўрэйскіх выдавецтваў Беларусі, Расіі і Украіны. Большасць кніг — на рускай мове.



Фота Вольгі ЛАСКІ.

Паводле слоў старшыні ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мікалая Чаргінца, яго арганізацыя ўжо стварыла бібліятэку СПБ, у якой выдаюцца кнігі сучасных аўтараў.

Таксама Мікалай Чаргінец падзякаваў паслу Ізраіля за выданне першага перакладу творчасці Васіля Быкава на іўрыт, якое было ажыццёўлена нядаўна. У той жа час, паводле слоў старшыні СПБ, Ізраіль «даведаўся пра беларускую мову значна раней. Тады, калі прэзідэнтам Ізраіля стаў выхадзец з Беларусі».

Выстава-кірмаш завершыць сваю працу 10 лютага. Ва ўсе дні працы выставы ўваход на яе будзе бясплатным.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

### КАНТРАБАНДА — 3 КМ ТКАНІНЫ

Гродзенскія пагранічнікі сумесна з рэгіянальнай Інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах канфіскавалі 3 км (50 рулонаў) мэблевай тканіны, якая не прайшла працэдуру мытнага афармлення. Агульны кошт канфіскаванай прадукцыі складае больш як Br53 млн.

**БЕЛТА.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### «ДВА Ў АДНЫМ». І ВЫШЭЙ ШАНЦЫ

**Чакаецца, што на працягу гэтага года на прафесійнае навучанне ці перанавучанне ў Беларусі будуць накіраваны 24,4 тыс. беспрацоўных.**

Прычым, як паведаміў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай Коханаў, сёлета не менш за 40 працэнтаў накіраванняў будзе выдавацца пад канкрэтныя заяўкі наймальнікаў. Дарэчы, адзначаюць у міністэрстве, прафесійнае навучанне беспрацоўных праводзіцца больш чым па 100 спецыяльнасцях, пры гэтым, каб павысіць шанцы на працаўладкаванне, апошнім часам тут робіцца стаўка на інтэграваныя прафесіі. У прыватнасці, асабліван папулярнасцю на рынку працы зараз карыстаюцца такія «сумешчаныя» прафесіі, як «муляр-мантажнік-пячнік», «муляр-страхар», «муляр-бетоншчык», «маляр-тынкоўшчык», «абліцоўшчык-плітачнік», «цясляр-сталяр», гандляр харчовымі і нехарчовымі таварамі», «токар-фрэзіроўшчык», «афіцыянт-бармен» і «повар-кандытар».

**Сяргей ГРЫБ.**

### ЛАНЦУГОВАЯ АВАРЫЯ

**Адразу 12 аўтамабіляў сталі ўдзельнікамі дарожна-транспартнага здарэння на Мінскай кальцавой дарозе.**

Як паведаміла начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі Жана Тройна, аварыя адбылася ўчора раніцай, прыкладна а палове дзявятай гадзіны. Напачатку сутыкнуліся 4 аўтамабілі. Узнік затор, які спрабаваў аб'ехаць кіроўца грузавіка. Аднак ён не справіўся з кіраваннем і зачапіў сваёй «фурай» некалькі машын, потым у гэтую «аўтакучу» стукнуліся транспартныя сродкі, якія праязджалі па суседніх палосах. У выніку гэтай ланцуговай аварыі атрымаў траўму 1 чалавек (з пераломам ключыцы ён быў дастаўлены ў бліжэйшы шпіталь) і пашкоджана 12 аўтамабіляў. Супрацоўнікі сталічнай ДАІ аператыўна адрэагавалі на здарэнне. Праз 7 хвілін яны ўжо былі на месцы ДТЗ і літаральна за 2 гадзіны «разрулілі» сітуацыю. Як адзначыла Жана Тройна, пакуль яшчэ дакладна не высветлены прычыны аварыі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ДА НАС ВЯРНУЎСЯ АГІНСКІ. ЧАСОВА, НА ЖАЛЬ

**6 лютага ў Мінску ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі прайшла прэзентацыя архіва Міхала Агінскага. Яго прывезлі для часовай дэманстрацыі з Масквы, дзе ён захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў. Туды архіў Агінскага трапіў у 1833-ім — яго тады перадаў сын кампазітара Ірэніюш.**

Вяртанне архіва стала магчымым па ініцыятыве Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА і пры фінансавай падтрымцы бюро ЮНЕСКА ў Маскве. Перамовы і ўсю падрыхтоўчую працу па выяўленні і вяртанні архіва ўзяў на сябе Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі. Дакументы архіва (ён уключае 5912 лістоў) будуць выкарыстаны нашымі навукоўцамі пры даследаванні творчасці Агінскага, якая з'яўляецца неад'емнай часткай беларускай культуры. Копіі пэўных дакументаў, мяркуецца, увойдуць у музейную экспазіцыю пасля рэстаўрацыі сядзібы Агінскага ў вёсцы Залессе Смаргонскага раёна, дзе, дарэчы, быў створаны знакаміты паланез «Развітанне з Радзімай».

**Леанід ТУГАРЫН.**

Пад рэбра

## НЕ СМЕШНЫЯ ГУЛЬНІ ВЯСЁЛАГА РУХУ КВЗ

**Расійскі «АМіК» і беларуская «Еўраліга» высвятляюць адносіны. «Яблыкам разладу» стала... назва КВЗ**

**Круглы год у Расіі доўжыцца сезон гульняў Клуба вясёлых і знаходлівых — масавага маладзёжнага руху, на якім вырасла не адно пакаленне яшчэ тых, савецкіх часоў. Дый у Беларусі кожны тыдзень хтосьці дзесьці гуляе ў КВЗ. Тысячы камандаў, мільённая аўдыторыя... Звычайныя ігракі, а тым больш гледачы, не ведаюць і не задумваюцца, як працуе нябачны фінансавы стрыжань вялікай піраміды, як узаемадзейнічае ланцуг ад школьнай каманды да асаў у Вышэйшай лізе, нарэшце, каму належаць правы на гульню.**

**Што значыць — каму, запярэчыць чытач. КВЗ — гэта від мастацтва, а мастацтва, паводле класікаў марксізму-ленінізму, належыць народу. Ат, калі б усё было так проста!**



**"АМіК" супраць Еўралігі — або Маслякоў супраць Мукавозчыка?**

### З гісторыі пытання

*У 1959 годзе тры чалавекі — урач Альберт Аксельрод, інжынер Уладзімір Якаўлеў і журналіст Сяргей Муратаў — прадставілі ў рэдакцыю маладзёжных праграм Цэнтральнага тэлебачання СССР ідэю праграмы-віктарыны — «Вечар вясёлых пытанняў». Раз на месяц праграма выходзіла ў прамым эфіры з Палаца культуры МДУ, пакуль не здарылася страшнае. У якасці жарту вядучыя прапанавалі прыз таму, хто прыйдзе летам у Палац у футры, валёнках і вушанцы, а з сабой прынясе фікус. На заклік адгукнуліся сотні масквічоў. Быў скандал, і праграму закрылі. На два гады. А потым у эфіры з'явілася першая перадача «КВЗ» — спачатку гэтаксама ў фармаце віктарыны, але з цягам часу ўсё з большым ухілам у бок гумару.*

*Уласна кажучы, гэтыя трое і з'яўляюцца «бацькамі» КВЗ. Гэта дакументальна зафіксавана і не аспрэчваецца. Далей пачынаюцца процілеглыя погляды, гарачыя спрэчкі і прыватныя меркаванні розных бакоў.*

**(Заканчэнне на 3-й стар.)**

Грошы

## Пакупнікі золата за месяц зарабілі на злітку ў 1 кг больш за $1000

**Кожны месяц, калі спецыялісты Нацыянальнага банка «падбіваюць» статыстыку аб продажы насельніцтву мерных зліткаў з каштоўных металаў, сведчыць пра адно — попыт на высакародны метал толькі расце. Так было летась. Пачатак гэтага года таксама не стаў выключэннем. Больш за тое, у студзені гэтага года зафіксаваны чарговы рэкорд: паводле звестак, якія карэспандэнту «Звязды» прадаставіў прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Жураковіч, за першы месяц аб'ём прададзеных фізічным асобам залатых мерных зліткаў у параўнанні са студзенем 2007 года павялічыўся амаль у... тры разы — з леташніх 84 кілаграмаў да сёлетніх 255 кіло.**



Мабыць, здзіўляцца падобнай дынаміцы і не варта: ужо з пачатку 2008 года на сусветных рынках цэны на золата пабілі гістарычныя максімумы, спачатку падняліся вышэй псіхалагічна важнай адзнакі ў 850 долараў, а потым наблізіліся да 900 долараў за тройскую ўнцыю. Што датычыцца цэнаў у нашай краіне, то мы ўжо адзначалі і раней — яны таксама не стаяць на месцы і растуць разам з сусветным коштам вечнага металу. Людзі гэта бачаць і робяць высновы. І тут яны абапіраюцца на кампетэнтныя меркаванні многіх экспертаў, у якіх, пагадзіцеся, сёння недахопу няма. Апошнія, каментуючы сітуацыю, гавораць: кошт золата штурхае ўверх, па-першае, няпэўнасць на фінансавых рынках, па-другое, — метал з'яўляецца добрым спосабам зберажэння ва ўмовах павышэння інфляцыі, і ў рэшце рэшт, на цану ўплывае слабасць долара ў адносінах да асноўных сусветных валют.

Што ж для тых нашых жыхароў, якія мелі дастаткова сродкаў, каб дазволіць сабе сур'ёзную залатую пакупку, месяц прынёс добрыя дывідэнды. Нягледзячы на тое, што найбольшай папулярнасцю ў людзей параненейшаму карыстаюцца 10-грамовыя злiткі, якіх за студзень было прададзена 2077 штук (26 працэнтаў ад агульнай колькасці), важкі «куш» усё ж такі прынеслі «брусы» больш саліднай вагі. І калі купля 1-грамовага злітка чалавеку ў студзені ніякіх выгод не прынесла (наадварот, на куплі-продажы такога злітка ў банку ён прайграў каля 1 долара ЗША), то набытыя, да прыкладу, 1-кілаграмовыя зліткі ўсяго за месяц прынеслі ў 1153 долары прыбытку: у канцы снежня мінулага года банк прадаваў насельніцтву мерны злітак вагой 1 кг па 27 790 долараў, а 5 лютага купляў такія «брусы» ўжо па 28 943 долары. Між іншым, толькі за студзень было рэалізавана 29 зліткаў па кілаграму і 48 — па 0,5 кілаграма.

Дарэчы, на фоне буму вакол золата продаж плацінавых і сярэбраных зліткаў выглядае вельмі ж ужо сціпла. Так, за першы месяц людзьмі было набыта ўсяго 88 плацінавых зліткаў агульнай вагой каля 0,65 кілаграма, а сярэбраных — 24 штукі аб'ёмам 6,74 кілаграма.

— Сёння людзі, якія бачаць нестабільнасць долара, не рашаюцца ўкладваць усе свае зберажэнні толькі ў беларускія рублі або еўра, — дзеліцца сваім меркаваннем аб сітуацыі, што складваецца, **эксперт «Звязды», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл Кавалёў.** — З даўніх часоў золата лічылася надзейным інструментам — адсюль і рост попыту насельніцтва рэспублікі. Другая прычына, якая рэзка падганяе цікавасць да каштоўнага металу, — сусветныя тэндэнцыі, калі долар перастае быць рэзервовай валютай, і ўсе ўкладваюцца ў золата, а яно імкліва даражэе. Людзі летась ўбачылі, што на куплі-продажы золата можна было зарабіць вялікія грошы.

Аднак тут ёсць і негатыўны момант. Усё ж такі золата зараз каштуе выключна дорага. Таким дарагім яно амаль ніколі не было, і таму стопрацэнтнай гарантыі, што да канца года яно не патаннее, я, напрыклад, даць не магу. Золата, на мой погляд, будзе заставацца такім жа дарагім дзесьці да выбараў у Злучаных Штатах, магчыма, цана яго будзе крыху хістацца. Аднак пасля таго як у ЗША, хутчэй за ўсё, перамогуць менавіта дэмакраты, падобна, што долар на нейкі перыяд часу пачне ўмацоўвацца. А калі ўмацоўваецца долар, золата — таннее. Золата даражэе, калі падае долар, або назіраецца агульная нестабільнасць на фінансавых рынках.

З пункту гледжання насельніцтва, мабыць, мае сэнс укладвацца ў золата, спадзеючыся, што яно не патаннее — дзесьці да лістапада. А вось з пункту гледжання банкаўскай сістэмы, манетарнай сістэмы дзяржавы дрэнна, калі насельніцтва зберажэнні ўкладвае ў каштоўны метал. Таму што гэты від зберажэння ляжыць мёртвым грузам у хатніх схованках людзей. Ёсць тыповыя прыклады краін, у якіх насельніцтва вельмі шмат укладвалася ў золата, і там не было інвестыцыйнага росту. Іншая справа, калі чалавек захоўвае долары альбо еўра ў банках: гэтыя грошы працуюць — на будаўніцтва жылля, камусьці іх выдаюць у якасці крэдыту на стварэнне бізнэсу і т.п. Залатыя ж зліткі, якія ляжаць у хатніх сейфах, на эканоміку не працуюць.

Між іншым, паводле апошніх даных Нацыянальнага банка, сёлета ў студзені бойка ішоў і гандаль атэставанымі брыльянтамі, якіх галоўны банк за месяц прадаў 113 штук агульнай масай 19,77 карата. Усяго ж на 1 лютага быў прададзены 2561 брыльянт масай 441,77 карата. Беларусы патрацілі на куплю каштоўных камянёў больш за 1,6 мільярда рублёў.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

### ЖЫЦЦЁ ЗА МЯСА?

Калі супрацоўнікі Пінскага РАУС паспрабавалі каля беларуска-ўкраінскай мяжы спыніць легкавушку, вадзіцель націснуў не на тормаз, а на газ. Міліцыянеры адкрылі стральбу. Жыхар Пінска вёз з Украіны тры тоны кантрабанднага мяса. Пашанцавала, а то за ялавічыну мог аддаць жыццё. Кулі трапілі ў прычэп і машыну.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Увага! Прамая лінія**

### «ПРАЦОЎНЫЯ» ЗАКОНЫ: ЁСЦЬ ПЫТАННІ?

Кантракты, выпрабавальны тэрмін, гарантыі маладым спецыялістам, водпускі, тэрміны выплаты зарплаты, працоўны час і ўмовы працы, нарэшце, некаторыя асаблівасці новага Працоўнага кодэкса — усё гэта стане тэмай чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам намесніка дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ірыны Фёдараўны ШЫЛЯЕВАЙ.

Такім чынам, увага! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» пройдзе 14 лютага з 16.00 да 17.30 па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.02.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 149,00 |
| 1 еўра | 3 140,55 |
| 1 латвійскі лат | 4 509,97 |
| 1 літоўскі літ | 908,98 |
| 1 чэшская крона | 122,26 |
| 1 польскі злоты | 874,41 |
| 1 расійскі рубель | 87,11 |
| 1 украінская грыўня | 424,68 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,6706 |
| 10 UAH | 48,3737 |
| 1000 BYR | 11,4627 |
| EUR | 36,0980 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 6.02.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

**Уважаемые акционеры ОАО «Черметремонт»!**

***24 марта 2008 года в 14.00** состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Черметремонт», место проведения собрания — по месту нахождения Общества: 223017 Минский район, п. Гатово, ОАО «Черметремонт», актовый зал.*

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах деятельности Общества за 2007 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2007 году. Оценка деятельности дирекции за 2007 год.
3. О результатах аудиторской проверки. Отчет ревизионной комиссии по результатам финансовой деятельности Общества за 2007 год.
4. Об утверждении годового отчета и бухгалтерского баланса за 2007 год. Утверждение бизнес-плана на 2008 год.
5. Об утверждении фактических расходов чистой прибыли по направлениям за 2007 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2008 год и I квартал 2009 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об утверждении условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О наделении наблюдательного совета полномочиями принимать решения по вопросам, отнесенным в соответствии с уставом Общества к компетенции собрания.
9. Об установлении предельного норматива средств, направляемых на оплату труда, сверх включаемых в затраты по производству и реализации продукции, товаров, работ, услуг и учитываемых при ценообразовании и налогообложении.

*Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 14.03.2008 г. Место и время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 12.00 до 13.50 по месту его проведения.*

*Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. При себе иметь документ, удостоверяющий личность, и доверенность (для представителей).*

*Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница) с 8.30 до 17.00, начиная с 13.03.2008 г. в приемной ОАО «Черметремонт», а в день проведения собрания — с 12.00 до 13.50 по месту его проведения.*

*Дирекция* *Наблюдательный совет*

УНП 600068756

**ОАО «Белаттракцион» проводит открытый аукцион по продаже собственного имущества**

Детские аттракционы с 1-го по 5-й лот, игровые автоматы с 6-го по 12-й лот (подробный перечень имущества указан на сайте www.belat.com). ***Аукцион состоится 18 февраля 2008 г. в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Могилевская, 68.*** Заявление на участие принимается до 15 февраля 2008 г.

**Тел./факс (8 017) 222 73 14.**

УНП 100061627

ISSN 1990 - 763X

08024

9 771990 763008

Чаму я чытаю «Звязду»

# «Газета захавала лепшыя традыцыі прэсы ранейшых часоў»

***Міхаіл Кірылавіч АЛЕЙНІКАЎ, пенсіянер, вёска Любонічы Кіраўскага раёна, падпісчык прыкладна з 15-гадовым стажам:***

— Да таго, як стаць пастаянным падпісчыкам «Звязды», я «перабраў» практычна ўсе беларускія выданні, але ў выніку спыніўся менавіта на ёй. «Звязда» — вельмі салiднае выданне, агульны яго тон — цікавы, без «заскокаў». Газета захавала лепшыя традыцыі савецкай прэсы, адаптаваўшы іх у сувязі з патрабаваннямі часу, але без гэтай часам вар'яцкай пагоні за чытачом, што характэрна зараз для некаторых выданняў. Найперш хачу сказаць пра сталасць, прывабнасць «Звязды», цікавасць і карыснасць яе для звычайных чытачоў — газета можа задаволіць разнастайнымі матэрыяламі любы густ.

Вельмі ўдалай, палітычна граматнай, кідкай даўно лічу першую старонку. На ёй вельмі аператыўна падаецца інфармацыя — умееце гэта зрабіць! Вельмі добрыя ў вас і загалоўкі — зноў жа ўмееце «закінуць вуду»! Прыцягне ўвагу які, абавязкова матэрыял адразу прачытаеш. Асабіста мне падабаюцца рэкламныя старонкі — акрамя навін пра нейкае прадпрыемства, з іх можна атрымаць шэраг іншых звестак, якія не заўсёды ў энцыклапедыі знойдзеш. Малайцы, хлопцы! Цікавая ўкладка «Мясцовае самакіраванне» — сапраўдная школа-семінар для мясцовага кіраўніцтва. Хто знаходзіцца пры гэтай справе — хваляць яе, бо там пішацца пра перадавы вопыт. Вось жонка Валянціна Аляксандраўна (*смяецца*) падказвае мне: падабаецца рубрыка «Казкі для дарослых». Мы нават аўтара «рассакрэцілі»: няхай яна ў перспектыве выдасць гэтыя матэрыялы асобнай кніжкай.

Хачу выказаць падзяку за цікавыя інтэрв'ю Таццяне Падаляк: умее яна знайсці пытанні, разгаварыць суразмоўцу, словам, зрабіць выдатны матэрыял. Але галоўнае — яе артыкулы вылучаюцца высокай культурай, інтэлігентнасцю і інтэлектуальнасцю. З глыбокім падтэкстам, тонкімі назіраннямі выходзіць «Простая мова» Валянціны Доўнар, шкада, што апошнім часам яна рэдка друкуецца. Цікавыя і яе «Валянцінкі». А вось у рубрыцы «Алё, народ на праводзе» адчуваецца адна рука, якая правіць большасць матэрыялаў пад адзін капыл. Няхай бы было больш «шурпата» — як сапраўды народ кажа.

Вольгу Мядзведзеву наноў разгледзеў — у яе душэўныя, не крыклівыя публікацыі, відаць, і яна такі ж чалавек. «Забівае» газету Ілона Іванова, мабыць, ваш самы пладавіты ўласны карэспандэнт (*смяецца*). Піша добра, адкуль тэмы паспявае браць? Калі ўжо пра жанчын загаварылі... Шмат эрудыцыі ў Вікторыі Ц., цікавы спосаб падачы яна знайшла. Але калі гэта дзённік — няхай бы было больш адкрытасці, а яна баіцца сябе адкрываць. Цікавая «Хатняя энцыклапедыя»; прыгадваем вашага ранейшага аўтара Мікалая Чахоўскага, а таксама Алену Ляўковіч, Сяргея Шаўцова...

Чаго не хапае? Глыбокіх публіцыстычных матэрыялаў аб асноўных тэндэнцыях развіцця краіны, выступленняў добрых палітолагаў, ідэолагаў: куды ідзе краіна, якія ідэі згуртоўваюць нацыю. Цяперашняя ўкладка «Чырвоная змена» — асабіста мне цяжка зараз зразумець, дзеля чаго яна... А некалі «Чырвоная зменка», калі быў студэнтам, была любімай маёй газетай. У прыватнасці, мне падаецца, што трэба больш пісаць пра вясковую моладзь: як адпачывае, як працуе, што ў яе за душой.

Калі дазваляе ваш «статус» строгага, салiднага выдання, адвядзіце раздзел пад сенсацыі. А ўвогуле «Звязда» для нас — эталон культуры, не ўжывайце, напрыклад, як пішуць вашы дзяўчаты, слова «тармазнуў». Прыстасаванне нейкае спрацавала? Жадаю, каб і стыль, і мова ў вас былі багацейшымі, асабліва больш паэтычнай, светлай мовы зычу маладым супрацоўнікам. Вось я з вамі на роднай мове пагутарыў — нібы да вялікага свету далучыўся!..


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## СПЕЦЫЯЛІСТ ШТО ТРЭБА

*У наступным годзе **Сяргею БУЯНУ** будзе семдзесят. А пакуль не «стукнула», у старыя сябе залічваць не збіраецца. І па-ранейшаму не закідвае інструмент і бондарскі рыштунак, робіць бочкі, цэбры і ўсё, што можна аднесці да кола прыгожай ручной працы. Гэтай справе яго ніхто не вучыў — уласнымі розумам і вопытам ахапіў усе прамудрасці і стаў выдатным спецыялістам. Сам зрабіў і неабходны інструмент, напрыклад цыркуль, які трымае ў руках (на фатаздымку).*

*Жыве майстар-бондар Сяргей Буян на далёкім ад райцэнтра хутары Лысуха Стружскага сельсавета Столінскага раёна, даглядае пчол, па гаспадарцы ўвіхаецца. Яго жонка Еўдакія Сяргееўна пячэ хлеб. У іх восем дзяцей і дзесяць унукаў. На жаль, ніхто з нашчадкаў пакуль не «загарэўся» рабіць рэчы, яшчэ такія неабходныя ў кожнай паляшуцкай гаспадарцы.*

## РАСІЙСКІ СПІРТ І БЕЛАРУСКІ МЕТАЛ

Раніцай 1 лютага на аўтатрасе паблізу горада Асіповічы супрацоўнікі міліцыі затрымалі машыну «Рэно-Лагуна». У аўтамабілі, за рулём якога быў беспрацоўны мінчанін, знайшлі 320 літраў вадкасці, якая ўтрымлівае спірт. Далейшае расследаванне завяло ў вёску Старынкі Бабруйскага раёна, дзе ў адным з дачных дамоў, які належаў беспрацоўнаму бабруйчаніну, было схавана больш за 400 літраў спіртавой вадкасці. Агульны кошт канфіскаванага спірту — амаль 44 мільёны рублёў.

Калі спіртавыя вадкасці вязуць з Расіі ў Беларусь, то ў адваротным напрамку — металічны лом. Увечары 3 лютага на беларуска-расійскай мяжы, паблізу вёскі Каськова ў Мсціслаўскім раёне затрыманы груз: 17,5 тоны лому каляровых металаў перавозілі два аўтамабілі, за рулём якіх былі жыхары Мінска і Барысава. Груз ацэньваецца ў больш за 80 мільёнаў рублёў.

**Алена КАЗЛОВА.**

Пазнай свой край

# Залатое кольца Глыбоцкага раёна

**У апошні час у нас сталі ўсё больш надаваць увагі развіццю сферы турызму. І гэта правільна. Бо ў нашай краіне ёсць усе ўмовы для прыцягнення замежных турыстаў. І не абавязкова мець свой выхад да мора або акіяна. Краін, якія прадстаўляюць менавіта такія паслугі, проста безліч. Нам трэба арыентавацца на іншае. І радуе тое, што шматлікія турыстычныя кампаніі гэта ўжо зразумелі, ва ўсякім разе пачалі разумець. А беларусы сталі задумвацца аб тым, што і дома можна культурна адпачыць, правесці свой водпуск.**

Сёння мы вырашылі распрацаваць свой турыстычны маршрут па Глыбоцкім раёне. Ён вельмі цікавы. Менавіта тут робяць знакамітае на ўсю краіну згушчанае малако, менавіта тут знаходзіцца геаграфічны цэнтр Еўропы, таксама — найглыбейшае возера краіны і яшчэ шмат чаго іншага. Тут нарадзіліся і пачыналі сваю дзейнасць «бацька беларускага тэатра» Ігнат Буйніцкі, мастак-фантаст і археолаг Язэп Драздовіч, вядомы польскі пісьменнік Тадэвуш Даленга-Мастовіч. Радзімай стала гэтая зямля для палітыка, гісторыка, літаратара, акадэміка Вацлава Ластоўскага. У Глыбокім нарадзіўся таленавіты архітэктар і дыпламат Клаўдзій Сцяпанавіч Душ-Душэўскі, вядомы рускі пісьменнік Лявон Ракаўскі, беларускі паэт Алесь Дубровіч. Сёння ўсяму свету вядома імя авіяканструктара, двойчы Героя Сацыялістычнай Працы Паўла Восіпавіча Сухога. Але аб усім па парадку.

### Горад Глыбокае

Першае пісьмовае згадванне аб мястэчку Глыбокае датуецца 1414 г. У гэтым раённым цэнтры сапраўды ёсць на што паглядзець. Сабор Нараджэння Святой Багародзіцы (1639—1654 гадоў пабудовы). Рэдкі чатырохвежавы храм пераходнага тыпу ад абарончай готыкі да ранняга барока. Заснаваны як касцёл і манастыр кармелітаў босых. У 1735 г. перабудаваны ў стыль віленскага барока. З 1878 года — праваслаўны храм.

Касцёл Святой Тройцы (1628 г.) — каменны храм збудаваны ў стылі віленскага барока. Сучасны выгляд набыў у 1908 г. Галоўная святыня — статуя Хрыста, перанесеная з касцёла кармелітаў. Цікавы той факт, што ў шостым зборніку «Сусветная гісторыя архітэктуры» побач з егіпецкімі пірамідамі прадстаўлены і саборы Глыбоччыны. Пагадзіцеся, гэта аб чымсьці гаворыць.

Таксама ў Глыбокім ёсць калона ў гонар Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. — самай дэмакратычнай у тагачаснай Еўропе. Яна размешчана на гарадскіх могілках.

Акрамя ўсяго гэтага, у Глыбокім ёсць таксама музей авіяканструктара Паўла Сухога, гісторыка-этнаграфічны музей, дом рамёстваў.

### «Беларускі Версаль»

Менавіта так называюць невялікую вёску Мосар Глыбоцкага раёна. Аб гэтым населеным пункце ходзяць сапраўдныя легенды. Менавіта ў Мосары імкнецца пабываць кожны турыст, які паважае сябе. Чаму? На гэта ёсць некалькі прычын. Па-першае, у гэтай вёсцы ёсць касцёл, якому больш як два стагоддзі. Па-другое, менавіта ў гэтым населеным пункце ніхто не п'е і не гандлюе спіртнымі напоямі. Патрэцяе, у Мосары можна ўбачыць самы вялікі ў краіне крыж, — яго вышыня — 23 метры. Але гэта, мабыць, не самыя галоўныя прычыны паломніцтва шматлікіх турыстаў. Адмысловую цікавасць у турыстаў выклікае ўвесь ландшафтны парк, які складаецца не толькі з аднаго касцёла, але і шматлікіх статуй, штучных вадаёмаў, рэдкіх для нашых мясцінаў дагледжаных могілак... Вакол касцёла немагчыма знайсці месца, дзе б не раслі кветкі. Прыехаўшы ў Мосар, складваецца такое ўражанне, што ты патрапіў у казку. Чаму б і вам, паважаныя чытачы, не з'ездзіць у Версаль? У вас ёсць такая магчымасць наведаць гэтае маляўнічае месца, не пакідаючы межаў нашай краіны. Нават візу не трэба рабіць.

### Геаграфічны цэнтр Еўропы

Больш як пяць гадоў таму навукоўцы высветлілі, што геаграфічны цэнтр Еўропы знаходзіцца менавіта ў Беларусі, а дакладней у возеры Шо на мяжы трох раёнаў: Глыбоцкага, Ушацкага і Полацкага. На той момант гэта было сенсацыйнай заявай. З часам на беразе возера плануецца пабудаваць амфітэатр, гасцініцу. Праўда, зараз там практычна нічога няма. Жыхары вёскі Івесь, якая размешчана непадалёк ад возера Шо, паставілі таблічку з надпісам, што менавіта тут знаходзіцца геаграфічны цэнтр Еўропы. Гэтым месцам цікавіліся нават швецкія тураператары. Але пагадзіцеся, што ўсё роўна цікава пабываць у геаграфічным цэнтры Еўропы. Да таго ж ён знаходзіцца зусім недалёка, у межах нашай краіны.

### Возера Доўгае

Возера Доўгае — найглыбейшае (53,7 м) возера ў Беларусі, якое знаходзіцца ў басейне Шашы, ля вёскі Доўгае. Плошча складае 2,6 кв.км. Даўжыня шэсць кіламетраў, сярэдняя глыбіня 16,6 метра, даўжыня берагавой лініі 14,9 кіламетра. Пагадзіцеся, у межах нашай краіны вельмі ўражлівыя лічбы. Цікава, што некаторыя мясцовыя жыхары зразумелі, што можна зарабляць грошы на аказанні турыстычных паслуг. Так, на беразе возера ёсць двухпавярховая хатка з усімі выгодамі. Усе ахвотнікі за ўмераную плату могуць пракаціцца на лодцы, выкупацца ў возеры, прагуляцца па маляўнічай мясцовасці, парыбачыць, раскласці вогнішча...

### Прazарокі

Менавіта гэты населены пункт лічыцца радзімай Ігната Буйніцкага, заснавальніка першага ў Беларусі прафесійнага тэатра. Таму вельмі сімвалічна, што менавіта ў Празароках адкрылі музей гэтаму дзеячу культуры. Не даязджаючы да вёскі, яшчэ з шашы, віднеецца неараманскі Узнясенскі касцёл пачатку XX стагоддзя. Ён выбудаваны з чырвонай цэглы. Крыху далей, за касцёлам — магіла Ігната Буйніцкага. А калі прайсці яшчэ далей, то можна ўбачыць царкву святых Пятра і Паўла, якая была пабудавана ў 1909 годзе.

### Удзела

У вёсцы Удзела можна паглядзець на Кляштар францысканцаў, заснаваны ў 1642 г. Будаўніцтва кляштарнага корпуса завяршылася толькі ў 1805 г., але ўжо ў 1809-ым комплекс пацярпеў ад пажару. У 1837 г. касцёл быў істотна перабудаваны ў стылі позняга класіцызму: зменены характар пакрыцця і завяршэння галоўнага фасада, а таксама афармленне інтэр'ера, дзе адзінай барочнай прыкметай застаўся крывалінейны абрыс арганных хораў.

### Пліса

З гістарычных помнікаў у Плісе захавалася Параскеўская царква, якую пабудавалі ў 1887-ым у рэтраспектыўна-рускім стылі. Мураваны храм меў тыповую 4-частkавую структуру, якая складалася са званіцы, трапезнай, малітоўнай залы. Над бляшаным дахам узвышаўся купал на драўляным барабане. Але ў 1949 годзе ў час моцнай буры з дзесяціметровай вышыні зваліўся перадалтарны карніз другога яруса асноўнага аб'ёму. Карніз прабіў дах, двайную столь, і ў рэшце рэшт упаў на алтар. У нашы дні Параскеўская царква адрамантавана і працягвае дзейнічаць.

Як мы бачым, паважаныя чытачы, цікава і з карысцю можна адпачыць і ў нашай краіне. Было б толькі жаданне. А магчымасці проста вялізныя. Узяць толькі адзін Глыбоцкі раён. Зараз застаецца толькі аднесці гэты план у адну з турыстычных фірмаў. Мабыць, хтосьці і задумаецца над маёй прапановай.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**


Вёска Мосар.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Народная энцыклапедыя

# ДАРОГА З-ПАД ВЯНЦА

**У адпаведнасці з рэгіянальнымі абрадавымі традыцыямі маладыя адразу пасля вянчання ў храме або шлюбавін у касцёле наведвалі самыя знакамітыя мясціны свайго роднага краю: свяшчэнны гай, цары-дубы, святыя крыніцы, гісторыка-культурныя помнікі, у савецкі час — мемарыяльныя комплексы. Здаўна актыўны дыялог паміж жывымі і памерлымі быў у душы і сэрцы кожнага беларуса, таму асабліва моцна загучала гэта традыцыя ў другой палове XX ст., у пасляваенны час, калі практычна кожная сям'я загойвала раны пасля жахлівага ліхалецця.**

Дарога да продкаў — гэта складаны псіхалагічны, духоўны і культурны феномен, за якім прыхавана не толькі глыбокая пашана і павага, не толькі памяць і светлы смутак, але яшчэ і гонар за свой род, маўклівая клятва-абяцанне памнажаць яго славу і адначасова падзяка за благаслаўленне на шчаслівы шлюб. Сучаснаму чалавеку, магчыма, цяжка зразумець гэты аспект абрадавых зносінаў паміж жывымі і памерлымі, але мяжа паміж гэтымі двума сусветамі была хоць і дакладна акрэсленая (звычайна магілкі абносілі лёгкай агароджай, а ў больш раннія эпохі — вакол іх капалі неглыбокі роў), але вельмі тонкая, празрыстая, амаль няўлоўная. Фактычна свет продкаў быў такой самай рэальнасцю, як дом, сядзіба, падворак, таму наведванне продкаў было нічым іншым, як рытуалам запрашэння іх на агульнародавую ўрачыстасць. Можна выказаць і яшчэ адно меркаванне адносна візіту маладых да сваіх продкаў. Хутчэй за ўсё, малады жаніх «прадстаўляў» сваім прадзедам тую дзяўчыну-нявесту, якой наканавана будзе працягваць род, і прасіў іх згоды-бласлаўлення.

Пасля рытуальнага бласлаўлення продкамі вясельны поезд накіроўваўся дахаты, да роднага парога. Аднак трэба заўважыць, што заключная частка дарогі «з-пад вянца» мела некалькі варыянтаў увасаблення. У розных куточках Беларусі існавалі розныя, часам супрацьлеглыя па характары выканання абрады, звязаныя з вяртаннем маладых дадому. У адным выпадку маладыя, падпарадкоўваючыся зыходнаму прыродна-касмічнаму прынцыпу «ўсё вяртаецца на кругі свае», накіроўваліся да хаты нявесты, у другім — ехалі да бацькоў маладога, у трэцім (што сустракалася вельмі рэдка, але ж было) — жаніх і нявеста раз'язджаліся кожны да сваіх бацькоў. І толькі праз дзень або нават і два жаніх забіраў нявесту да сябе. Сёння мы сталі сведкамі таго, што адвечны прынцып вяртання да роднага парога (г. зн. адкуль вясельны поезд адправіўся, туды і павінен вярнуцца) парушаецца на кожным кроку. Замест таго, каб **ад месца ўшанавання продкаў прыехаць да месца пражывання маладой пары,** мы адразу ж пасля вянчання накіроўваем вясельны картэж да сталоўкі або рэстарана.

Кожная з пералічаных раней версій мае права на існаванне, таму нам неабходна іх разгледзець, акцэнтуючы ўвагу на логіцы пабудовы таго ці іншага абрадавага ходу.

### «Лавіць зайца»

Здавалася б, пасля наведвання памятных мясцін вясельны картэж павінен выйсці на фінішную прамую і без усялякіх перашкод пад'ехаць да бацькоўскага парога. Аднак, аказваецца, нават добра знаёмая з дзяцінства вясковая вуліца хавала ў сабе шэраг нечаканасцяў для дружыны жаніха і нявесты. На Брэстчыне перад самой вёскай вясельны картэж павінен быў праехаць пад незвычайнай, прыгожай аркай, створанай з пераплеценых паміж сабой дзвюх бяроз, якія стаялі па абодва бакі дарогі. А на скрыжаванні дарог або каля хаты каго-небудзь з аднавяскоўцаў людзі ўвогуле перагароджвалі дарогу вясельнаму картэжу. У розных раёнах Беларусі гэты абрад атрымаў самыя нечаканыя назвы: «брама», «рагатка», «пярылы», але самай распаўсюджанай аказалася назва «лавіць зайца» («закідваць» або «драць зайца»).

«Зайца драць» — браць выкуп на вяселлі, звычайна гарэлкай, перагарадзіўшы дарогу маладым: *«Ніхай ужо мыладзейшыя, дык і ён зь імі пыцягнуўся зайца драць».*

А цяпер прывядзём прыклад таго, як выконваўся абрад «лавіць зайца». У Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці «на зваротным з царквы шляху маладых у кожнай вёсцы, праз якую яны праязджаюць, спыняюць у «вешніцы» — ставяць стол, аздоблены кветкамі, на стале — хлеб, пасыпаны соллю, і шклянка, поўная вады, — «каб жыццё іх было поўнае». Малады павінен даць выкуп — «гасцінец»: цукеркі, калі няма, дык грошы; грошы даюць таму, хто прымушае, — звычайна моладзі. У сваёй вёсцы маладога таксама затрымліваюць — ён павінен зноў плаціць выкуп. Бывае так, што, пакуль ён даедзе да сваёй вёскі, яму ўжо няма чым плаціць... Пасля выкупу маладыя пад'язджаюць да ганка маладой».

Зразумела, што ў гэтым старажытным па паходжанні абрадзе адлюстраваліся не толькі ўласна культуральныя праявы, але і сацыяльна-эканамічныя адносіны. Удзельнікі абраду перагароджвання былі нікім іншым, як звычайнай рэгіянальнай мытняй. Забягаючы далёка наперад, звернем увагу яшчэ на адзін рытуал, які самым цесным чынам звязаны з аналізуемым. Калі сваты напрыканцы дзяльбы каравая кідалі ў гурт моладзі падэшву ад рытуальнага хлеба, то хлопцы і дзяўчаты навыперадкі імкнуліся схапіць яе першымі. Звычайна хлопцы закідвалі «падэшву» ў запечак, каб «дзеўкі з іх вёскі не выходзілі замуж за хлопцаў з іншых вёсак», а дзяўчаты, наадварот, стараліся выбегчы ў двор і кінуць яе на дах, каб пайсці замуж за хлопцаў з суседніх вёсак. У такім разе «ўвоз» нявесты з чужой вёскі падлягаў абавязковаму выкупу (мытная пошліна).

На сярэдзіну вуліцы выносілі стол або табурэтку, накрывалі чыстым абрусам, ставілі вядро з вадой, клалі бохан непачатага хлеба, побач — сальнічку. Маглі запаліць свечку. Дарогу звычайна перагароджвалі маладыя хлопцы. Іх адорвалі цукеркамі, печывам, дробнымі грашамі. Не падпарадкавацца патрабаванням вясковай «мытні» было нельга. У наш час гэты звычай захаваўся на ўсёй тэрыторыі Беларусі, аднак яго сутнасць ужо страчана. Часцей за ўсё вуліцу перагароджваюць старыя людзі, якія патрабуюць «на кожны вугал табурэткі паставіць па пляшцы гарэлкі».

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК.**

***(Працяг будзе.)***

## БРЫЛЬЯНТАВАЕ ВЯСЕЛЛЕ


*З Аксанай Феакцістаўнай ваенны марак Міхаіл Міхайлавіч Міцкевіч з Гомеля пазнаёміўся ў далёкіх 40-х гадах мінулага стагоддзя, а ў студзені 1948 года згулялі вяселле. І да гэтага часу разам, паказваючы прыклад моцнага сямейнага саюза, аграненага жыццёвымі выпрабаваннямі, павагай адзін да аднаго і вялікім сапраўдным каханнем.*
Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

## Звярнуўся ў міліцыю, запоўні анкету

«Ноў-хаў» у рабоце міліцыі Віцебскай вобласці: цяпер той, хто пісьмова звернецца па дапамогу, атрымае разам са спецыяльным талонам паведамлення аб тым, што заява прынятая, і анкету, якую можна бясплатна адправіць па пошце міліцэйскаму начальству — ва УУС вобласці. Марка на анкеце-паштоўцы ўжо ёсць.

— Эксперымент ажыццяўляецца пакуль што толькі ў нашай вобласці. Мы такім шляхам хочам вывучыць грамадскую думку наконт эфектыўнасці дзейнасці міліцыі, — расказвае начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Леанід Фармагей. — Летась 65 тысяч чалавек запоўнілі заявы ў міліцыі. Калі хоць бы тысяч трыццаць адкажуць на пытанне анкеты і дашлюць нам, мы зможам правесці нядрэннае даследаванне. У анкеце пытанні аб тым, як хутка прыехаў па выкліку міліцэйскі нарад, як зарыентаваліся ў сітуацыі і іншыя.

Акрамя гэтага, паводле слоў палкоўніка Фармагея, цяпер спецыяльная апаратура фіксуе ўсе тэлефонныя званкі ў аддзелы міліцыі. І потым можна будзе праслухаць, з якой інтанацыяй супрацоўнік адказваў грамадзяніну, ці быў ветлівы, ці дасканала высвятляў праблему? І, безумоўна, у дачыненні да няўважлівых супрацоўнікаў будуць прыняты дысцыплінарныя меры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Простыя рэчы

# ТОРФ


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Беларусь багатая не толькі на рэкі ды азёры, не толькі на лясы, але і на балоты. Яны складаюць недзе больш за дзесяць працэнтаў усёй тэрыторыі. А там дзе балота — там і тарфянікі. Сама назва торф, відаць, не зусім беларуская, у вясковай мове, у тых вёсках, якія стаяць ля балот і сёння можна пачуць такія яго назвы, як алёс, альса. Увогуле ж торф, гэта простая, малапрываблівая рэч, якую зачэрпнеш на тарфяніку даланёй, разатрэш і выкінеш назад за непатрэбнасцю, мае нямала каштоўнага, асабліва для нас, беларусаў. Торф выкарыстоўваецца як прамысловае і камунальнае паліва, у сельскай гаспадарцы ідзе на кампосты і торфамінеральныя ўгнаенні, яго выкарыстоўваюць для атрымання воцатнай кіслаты, спірту, кармавых дражджэй, горнага воску, фенолаў, парафіну, антысептыкаў, з яго атрымліваецца і ізаляцыйны матэрыял. Той, хто сур'ёзна займаецца вырошчваннем агародніны, садавіны, ведае яго як выдатны ўпаковачны матэрыял. Нездарма ў нашай краіне дзейнічае Інстытут торфу.

А яшчэ ў пачатку XX стагоддзя Аркадзь Смоліч, апісваючы беларускія балоты, зазначаў: *«Ляжаць іхнія велізарныя прасторы ў нас цяпер без усялякае карысці для людзей. А ўсё затым, што ня ўсюды яшчэ навучыліся нашыя людзі карыстацца з вялікага скарбу, які схаваны ў гэтых балотах, з торфу».*

Запомніўся ў нейкім творы Янкі Брыля такі эпізод: бацька з ямы шпурляе вялікія чорныя цагліны торфу, а герой адносіць іх, складае адна пры адной. Але гэта не нарыхтоўка паліва. Гэты торф прызначаны на кампосты. Гэта слова мае складанае паходжанне. У лацінскай мове ёсць compositus, што азначае састаўны. А вось у англійскай мове ўжо бліжэйшае нам — compost. Яно і зразумела. На працягу стагоддзяў культура, у тым ліку і культура земляробства, ішла да нас з захаду, з Еўропы.

А кампосты — гэта арганічныя ўгнаенні, якія складаюцца з сумесі торфу, гною, саломы, адходаў сельскай гаспадаркі. Нашы дзяды і бацькі яшчэ дадавалі туды драўляны попел. Пры аднаасобнай гаспадарцы мала было мець шмат зямлі. Трэба было яе як след угноіць, каб вырас ураджай, каб не дарэмнай была цяжкая сялянская праца. А дзе ж ты набярэшся таго гною? Ну, тры — чатыры каровы ў гаспадарцы. А калі зямлі больш за дзесяць гектараў? Вось і стараліся людзі з бліжэйшага балота назапасіць торфу, змяшаць яго з гноем. Каб больш было гэтага самага ўгнаення. Вось і Брыль ў вышэйзгаданым эпізодзе, відаць, апісвае такую нарыхтоўку.

У Беларусі ўжываліся і сёння найбольш ужываюцца торфа-гноевыя, торфа-попельныя, торфажыжкавыя кампосты. Першыя дзве назвы зразумелыя. А вось патлумачыць апошнюю пастараюся мякчэй для празмерна інтэлігентнага чытача. Стаіць ферма. Там, зразумела, ёсць гной. Гэта вядома, хоць і неэстэтычна. Але ж яшчэ Сяргей Ясенін кідаў у пецярбургскія салоны:

*А хлеб, который жрете вы?*
*Ведь мы его того, навозом...*

Дык вось, з фермы яшчэ нешта і цячэ. І тое, што цячэ, перамешваюць з торфам. Атрымліваецца торфа-жыжкавы кампост. Дарэчы, вышэйназваныя кампосты амаль раўнацэнныя гною.

Я прыйшоў працаваць у раённую газету ў пачатку сямідзесятых гадоў. Тады для раённых газетчыкаў выраз «нарыхтоўка арганічных угнаенняў» быў вельмі актуальным. Як толькі пачыналіся маразы, станавілася магчымым выехаць трактарам на поле — пачыналася нарыхтоўка гэтых самых арганічных угнаенняў — торф змешаны з гноем. Торф вывозілі ўсёй наяўнай калгаснай тэхнікай. Вывозілі з радовішчаў, якія былі ў раёне, вывозілі з суседніх раёнаў. Едзеш па дарозе, а наўзбоч, па палях вырастаюць вялізныя сцірты ўгнаенняў. Іх па памерах, вышыні можна было параўнаць са сціртамі саломы, якія сцягваліся з палёў падчас уборкі. Заданні даводзіліся вялікія, праца ішла нават без выхадных. У раённай газеце з нумара ў нумар друкаваліся зводкі аб выкананні гэтых заданняў. Наколькі помніцца, на гектар ворыва пад прапашныя культуры трэба было вывезці 60 тон угнаенняў, пад збожжавыя крыху менш. І гэта было вельмі апраўдана. Ніякія мінеральныя ўгнаенні (без іх таксама не абысціся) не маглі замяніць арганіку, тое натуральнае, што забяспечвае ўраджай. Таму і ўраджаі ў сямідзесятыя — васьмідзесятыя гады раслі год ад году. Не абыходзілася без прыпісак, але рост быў відавочны. Сёння такія бурты на палях можна пабачыць рэдка дзе. Паменела тэхнікі ў сельгаскааператывах. Пра паліва ж і гаварыць няма чаго. Няма ранейшага разліўнога мора дызпаліва, бяздумнага яго расходавання. Толькі на самае неабходнае — сяўбу, уборку. Не, гной ад фермаў, зразумела, вывозіцца, але ж добрыя ўраджаі вырастаюць за кошт іншых крыніц. Найперш лепшай становіцца сама тэхналогія земляробства.

Значэнне торфу як паліва атрымлівае новы ўзровень для Беларусі ў нашы дні, калі «шляхетная» ў дачыненні да яго вуглевадародная сыравіна становіцца не толькі прадуктам продажу, але і інструментам палітыкі. А між іншым у нашай краіне першая прамысловая распрацоўка торфу пачалася яшчэ ў 1896 годзе, у Аршанскім павеце. Торф выкарыстоўвалі ў газагенератарах. А ў 1940 годзе торф даваў 64 працэнты паліва нашай рэспублікі. Асноўным палівам торф быў у нас да 1960 года ў развіцці энергетыкі. На торфе працавалі ДРЭС, ЦЭЦ. Выкарыстоўвалі торф у якасці паліва і ў Польшчы, Ірландыі, Даніі, Швецыі.

У 1927 годзе ў Дубровенскім раёне на Віцебшчыне ўзнікла новае паселішча — Асінторф. Сёння гэта гарадскі пасёлак. А прычынай узнікнення пасёлка стала будаўніцтва на асінаўскіх тарфяных масівах раённай электрастанцыі — БелДРЭС. Пішучы гэты артыкул, успомніў, што падчас вучобы ў БДУ, як кажуць, праходзіў і беларускую савецкую паэзію 30—40 гадоў мінулага стагоддзя. Помню, была нават паэма пра сацыялістычнае будаўніцтва, якая так і называлася «Асінторф». Дакладна аўтар не запомніўся. Перагартаў даведнікі, падручнікі па літаратуры. Не знайшоў. Старых падручнікаў ужо няма, а ў сучасныя той твор па зразумелых прычынах ужо не трапіў.

Ёсць у торфа яшчэ адна вельмі каштоўная якасць — лекавая. Тарфяная гразь дапамагае пры хранічнай хваробе органаў руху, запаленчых працэсах брушной поласці. За сваё жыццё мая маці пабывала ў санаторыі толькі адзін раз. Помніць, што ў Ждановічах пад Мінскам ёй прызначалі і гэтыя працэдуры.

А вось для жыхароў райцэнтраў, маленькіх пасёлкаў торф, торфабрыкет ужо шмат дзесяцігоддзяў нароўні з дровамі з'яўляецца асноўным відам паліва. Некалі мне давялося пабываць на торфабрыкетным прадпрыемстве «Віцебскае», якое знаходзіцца недалёка ад чыгуначнай станцыі Круляўшчызна Докшыцкага раёна. Вельмі працяглае, досыць складанае і энерганасычанае гэта прадпрыемства. Таму, відаць, і цэны на торфабрыкет няўхільна павышаюцца. Попыт на яго змяншаецца і з гэтай прычыны. Але ўсё роўна без торфабрыкету ў правінцыі пакуль што не абысціся. У любую пару — летам ці восенню, зімою ці вясной — ідзеш па родным гарадку, і на якой-небудзь з вуліц, а то і на некалькіх, абавязкова ўбачыш у дварышчах, ля весніц выгружаныя самазвалам гурбы чорнага, бліскучага ў прапечаных баках торфабрыкету.

Такая справа не можа абысціся без талакі. Асабліва, калі ў хаце жывуць старыя людзі ці ўвогуле адзін стары чалавек. Як правіла, падвезці паліва пад той хляўчук, дзе яно захоўваецца, немагчыма — ні трактар, ні машына не праедуць. І вось збіраюцца вёдры, іншыя ёмістасці, прыходзяць суседзі ці сваякі. Жанчыны нагружаюць, мужчыны носяць і высыпаюць брыкеціны ў патрэбнае месца. Выпісваецца, як правіла, 2—6 тон. Праца не столькі цяжкая, колькі брудная. Якім бы якасным торфабрыкет ні быў, ён крышыцца пры перагрузках, транспарціроўцы. Чорнага пылу хапае. Паспрабаваў прыкінуць: колькі разоў давялося ўдзельнічаць у такіх талоках і на сваім панадворку, і ў суседзяў, сваякоў? Ды сотні і сотні разоў. Так што пераняньчыў я ў сваіх руках гэтага торфу даволі, каб спачатку быць незадаволеным гэтай бруднаватай справай, потым ставіцца да яе памяркоўна, а цяпер і проста мець павагу да паліва, якое дае нам наша беларускае балота, а значыць, наша беларуская зямля.

У Пастаўскім раёне шмат тарфянікаў. Бывалі гады, што для пажарных, ды і многіх іншых службаў раёна яны прыносілі нямала клопатаў і праблем у летні час. Прычым тушыць тарфянік вельмі складана. Нібыта зверху ён абтушаны. А ўнутры, на глыбіні, і досыць вялікай, тленне працягваецца, у любы момант пажар можа ўспыхнуць з новай сілай. Дзякаваць богу, на Пастаўшчыне мінулым летам было некалькі невялікіх узгаранняў на тарфяніках, якія практычна не прынеслі вялікай шкоды.

Ну вось, бадай, і ўсё, што хацеў расказаць, пра простую рэч — торф, якім так багата наша Беларусь і які, як і ўся наша зямля, — нацыянальная гордасць.

**Алесь КАСЦЕНЬ,**
*вёска Касцяні Пастаўскага раёна.*

# МАНІПУЛЯЦЫЯ З ПЕРФАРАЦЫЯЙ

## прывяла ўрача-гінеколага на лаву падсудных

**Гэта гісторыя бярэ свой пачатак з канца снежня 2006 года, а закончылася толькі ў мінулым месяцы, калі, як гаворыцца, былі расстаўлены ўсе кропкі над «і». У тым сэнсе, што сваё слова на падставе многіх глыбока прааналізаваных фактаў і доказаў сказалі спачатку суд першай інстанцыі, а затым ужо і судовая калегія па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда. З усяго сказанага вынікае, што сітуацыя была няпростая, неардынарная, і важна было аднавіць справядлівасць.**

І калі, дарэчы,ісціца Валянціна Петрачкова (прозвішчы і імёны ў гэтым артыкуле зменены па этычных меркаваннях) лічыць, што ўсё пастаўлена на свае месцы, дык адказчыца Ніна Васільева, наадварот, цвёрда прытрымліваецца думкі — яна ні ў чым не вінаватая, яна незаслужана пакараная. На гэту пазіцыю, на абарону Васільевай, сцяной паўсталі каля пяцідзесяці ўрачоў-гінеколагаў Гомеля, якія прыслалі ў суд сваю заяву аб тым, што Ніна Пятроўна як высокакваліфікаваны спецыяліст «усё робіць правільна» і што не ўсё «можа залежаць ад урача», маючы на ўвазе рызыку ўскладнення пасля аперацыі. Цяжка сказаць, чым кіраваліся ўказаныя дактары (салідарнасцю са сваёй калежанкай або нейкай упэўненасцю ў сваёй праўдзе), калі б не два заключэнні-вывады сталічных судова-медыцынскіх экспертыз ад 10 мая і 10 жніўня мінулага года, якія маюць абсалютна супрацьлеглы характар. Але аб усім па парадку.

...Муж Валянціны Сяргееўны Барыс Пятровіч, знаходзячыся на вуліцы з дачкой у чаканні жонкі, якая пайшла да ўрача-гінеколага аднаго з філіялаў цэнтральнай гарадской палiклiнiкi, устрывожыўся, калі ўбачыў, як яна непрывычна цяжка, трымаючыся за поручні, ідзе па прыступках. З пабялелым тварам жанчына праз пэўны адрэзак часу паскардзілася, што ёй дрэнна: баліць ніз жывата і ідзе кругам галава. Калі падымаліся ў ліфце ў сваю кватэру, ёй стала яшчэ горш і яна страціла прытомнасць. Барысу Пятровічу давялося выклікаць яе маці, каб прыгледзела за дачкой.

Крыху ачуняўшы, Валянціна Сяргееўна задумалася: нешта тут не так, як трэба, прыгадваючы ўсе «этапы» яе звяртання ў паліклініку з просьбай-кансультацыяй надзейна засцерагчыся ад нежаданай цяжарнасці. На першым з іх доктар Васільева накіравала яе пасля агляду да тэрапеўта, параіла здаць адпаведныя аналізы, зрабіць кардыяграму, што тая і выканала. А на другім ужо ўзялася непасрэдна за канкрэтную справу, палічыўшы, што лепш за ўсё ў якасці надзейнай кантрацэпцыі трэба прымяніць унутрыматачную спіраль фірмы «Юнона-бія-Т», з чым пацыентка і пагадзілася.

У час адпаведнай маніпуляцыі Валянціна Сяргееўна раптоўна адчула моцны боль. І страціла прытомнасць. Да прытомнасці медык прывяла яе з дапамогай нашатырнага спірту. Урач прапанавала ёй крыху адпачыць і сабрацца з духам, а потым зноў узялася за маніпуляцыю. Кліентка, як расказала потым на судзе, зноў страціла прытомнасць. А тут яшчэ і ў ліфце такі ж самы паўтор, і боль у нізе жывата не праходзіць. Не, нешта тут не так, як належыць у падобных выпадках.

Але нічога, усё выправіцца, як казала доктар, трэба толькі папрымаць болесуцішальныя сродкі і праз дзесяць дзён з'явіцца да яе.

Гэтага тэрміну Петрачкова не дачакалася, болі не спыняліся, час ад часу вострa нагадваючы пра сябе. І жанчына накіравалася ў паліклініку. Ніна Пятроўна прыйшла да высновы, што пацыентка павінна прайсці ўльтрагукавое даследаванне, бо інакш не выявіш, што ж здарылася. Дыягназ таго абследавання ашаламіў жанчыну: адбылася так званая перфарацыя сценкі маткі, і гэта азначала, што спіраль прабіла яе і... апынулася не там, дзе трэба, а ў брушной поласці. Што рабіць?! Толькі хірургічная аперацыя — і нічога больш.

Вось такім чынам Валянціна Сяргееўна, як кажуць, і вымушана была легчы пад нож у бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, дзе знаходзілася больш як дзесяць дзён. Што яна перанесла пры гэтым, можна толькі здагадвацца, бо, акрамя перажыванняў за сваё здароўе, былі яны і за сямімесячнае дзіця, якое было пазбаўлена матчынага малака і пяшчоты, і за сям'ю. Таму, не дачакаўшыся ад урача самага элементарнага — належнай увагі, звярнулася ў суд, усе перыпетыі якога мы прыводзіць не будзем. Вылучым толькі галоўнае.

Ніна Пятроўна была цвёрда ўпэўнена (і гэта ўвесь час гучала, як пры следчых дзеяннях, так і ў апошніх яе словах на судовых пасяджэннях), што тая непрыемнасць адбылася з-за прамашкі, не па яе віне, а з-за таго, што арганізм пацыенткі мае свае адметнасці, свае асаблівасці, што раней ёй рабілі кесарава сячэнне. Вось і ўсё. Яна павінна быць цалкам апраўдана.

Судова-медыцынскія эксперты, якія, як вядома, аб'ектыўна ацэньваюць сітуацыю, прыйшлі да высновы, што ўрач-гінеколаг Ніна Васільева дапусціла — пры ўсёй да яе павазе — самую элементарную халатнасць. А менавіта: яна не выканала патрабаванні службовай інструкцыі па аказанні хірургічнай, амбулаторна-клінічнай, акушэрска-гінекалагічнай дапамогі, якой і павінна была кіравацца ў сваёй рабоце. Самае простае пытанне: калі пацыентка ў крэсле страчвала прытомнасць, то чаму адразу доктар не прызначыла ёй ультрагукавое даследаванне? Няўжо лішнім быў бы такі кантроль? І яшчэ. Урач павінна была прадбачыць ускладненні маніпуляцыі. І гэта, аказваецца, не было ўлічана. Тым больш што характарызуецца яна як высокакваліфікаваны спецыяліст.

Суды ўлічылі і гэтыя акалічнасці, і тое, што на ўтрыманні доктара дзіця, што ў выніку неналежнага выканання прафесійных абавязкаў Нінай Васільевай пацыентцы па неасцярожнасці прычынены цяжкія пашкоджанні, і таму прыгаварылі яе на падставе часткі 1 артыкула 162 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь да паўтара года папраўчых работ з утрыманнем дзесяці працэнтаў заробку ў даход дзяржавы. Яна ж выплаціць 650 тысяч рублёў ісціцы за аказанне апошняй юрыдычных паслуг, а таксама (але ўжо дзяржаве) 93 тысячы рублёў пошліны. У якасці кампенсацыі маральнай шкоды Валянціна Петрачкова атрымае два мільёны рублёў, якія выплаціць ёй паліклініка.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# НЕ СМЕШНЫЯ ГУЛЬНІ...

### Бакавыя паверхні

«Вялікі» КВЗ — у сэнсе, Вышэйшая ліга, якая прадстаўляе своеасаблівую эліту руху, выходзіць у прайм-тайм на расійскім Першым канале і з'яўляецца ружовай марай практычна кожнага іграка. Кіруе ўсім гэтым працэсам вось ужо больш як 45 гадоў прэзідэнт Міжнароднага саюза КВЗ і тэлевізійнага творчага аб'яднання «АМіК» Аляксандр Маслякоў. Крыху меншай значнасцю валодае так званая Прэм'ер-ліга КВЗ, але і ёй запраўляе Аляксандр Маслякоў — праўда, ужо малодшы. Таму для большасці камандаў КВЗ увогуле — гэта Маслякоў, адзіны ў многіх асобах. Зрэшты, ёсць яшчэ некалькі ўплывовых людзей — у прыватнасці, генеральны дырэктар ЗАТ ТТА «АМіК» Навум Баруля, а таксама рэдактары Вышэйшай лігі Андрэй Чывурын і Леанід Купрыда.

І беларусы тут не выключэнне. Бо айчынны рух КВЗ, па-першае, удвая маладзейшы (толькі летась адзначыў 20 гадоў), а па-другое, наша мясцовая цэнтральная Еўраліга — структурнае падраздзяленне Міжнароднага саюза КВЗ, адно з 11 (і, паводле неафіцыйнага рэйтынгу, ці не самае моцнае звяно). Але і ў нас гэтаксама ёсць персона нумар адзін, з імем якой звязаная гульня, у першую чаргу тэлеверсія — старшыня Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «КВЗ» і вядучы Еўралігі Андрэй Мукавозчык.

Глыбей, напэўна, капаць пакуль не варта — у прынцыпе, усе дзеючыя асобы і арганізацыі названыя. Засталося дадаць, што ўжо шмат гадоў яны супрацоўнічаюць менавіта такім чынам: мясцовыя каманды — рэгіянальныя чэмпіянаты — Еўраліга — Вышэйшая ліга. Безумоўна, прысутнічала пэўная канфрантацыя інтарэсаў, але ў цэлым склалася нармальная рабочая схема. Штогод Еўраліга заключала з «АМіК» дагаворы на працяг супрацоўніцтва, штогод пастаўляла новыя «загартаваныя» каманды, многія з якіх дасягалі адметных вынікаў. І раптам, як гром — навіна: у студзені 2008 года на чарговым Сочынскім фестывалі «КіВіН» абвяшчаецца, што «цэнтральную Еўралігу КВЗ мы на год адпраўляем у акадэмічны водпуск». А паколькі свята месца пуста не бывае, то, як паведамілі рэдактары Вышэйшай лігі МС КВЗ Андрэй Чывурын і Леанід Купрыда, «прынята рашэнне адкрыць міжрэгіянальную Палескую лігу ў Гомелі». Адным з рэдактараў там будзе Юрый Кручонак, які раней быў рэдактарам Еўралігі, другім — Аляксандр Трафімаў, двухразовы чэмпіён, аўтар і акцёр каманды КВЗ БДУ. Яшчэ праз некалькі дзён становіцца вядома, што дагавор ТТА «АМіК» з Еўралігай у аднабаковым парадку спынены — па ініцыятыве расіян. Перакладаючы на зразумелую мову, гэта значыць, што шлях беларускіх КВЗшнікаў у Вышэйшую лігу — адпаведна, у тэлепраграму са шматмільённай аўдыторыяй — істотна ўскладняецца. А хто вінаваты? Як заўжды, існуюць дзве праўды. Як мінімум.

### Спрэчны момант

Калі ўнікаць у сутнасць канфлікту падрабязна, рызыкуеш элементарна заблытацца ў мностве абрэвіятур, дат, лічбаў і бюракратычным ліставанні. Таму абазначым толькі асноўныя прэтэнзіі бакоў.

Першым каменем у беларускі агарод сталі заўвагі ТТА «АМіК» адносна праграмы «Вось дык шоў!», якая выходзіць на беларускім жа тэлебачанні. Андрэй Мукавозчык спаслаўся на ўказ прэзідэнта МС КВЗ, прыняты яшчэ ў 2003 годзе, паводле якога акцёры камандаў КВЗ могуць удзельнічаць у тэлепраектах **не вышэй за рэгіянальны ўзровень**, інакш — не маюць права ўдзельнічаць у гульнях Вышэйшай лігі, і наадварот — удзел у гэтых гульнях выключае здымкі ў пабочных праектах вышэй за рэгіянальны ўзровень. Для парушальнікаў прадугледжаны штрафныя санкцыі, да поўнай дыскваліфікацыі каманды.



**Каманда БДУ некалькі разоў была чэмпіёнам Вышэйшай лігі. Маладому «Прынцыпу БДУ» гэта ўжо не свеціць?**

Летам 2007 года з'явіліся два тэлепраекты — «Yellow Black White Show» у Казахстане і «Вось дык шоў!» у Беларусі. Адносна першага гендырэктар «АМіК» Навум Баруля пракаментаваў, што «калі асобныя ігракі не выкарыстоўваюць вобразу ўдзельнікаў камандаў, тэксты і брэнд «КВЗ», у нас няма да іх прэтэнзій». Што датычыцца беларускага шоў, рэакцыя была больш жорсткая: трэба або змяніць вядучага Еўралігі, або ўдзельнікам праграмы вырашаць — хочуць яны здымацца ў гэтай праграме або ў тэлевізійнай лізе. Гэтаксама падкрэслівалася, што ўсімі правамі на тэлеперадачу КВЗ і таварны знак «КВЗ» валодае ТТА «АМіК», таму выхад на беларускім тэлебачанні перадачы «Беларускі КВЗ» неправамерны, і з гэтым таксама трэба штосьці рабіць. Уласна кажучы, адмова выконваць «прадпісанні» і прывяла да вышэй узгаданага «акадэмічнага водпуску» Еўралігі.

Пазіцыя **старшыні МГА «Беларускі КВЗ» Андрэя Мукавозчыка**:

— Усе 9 гадоў, што існуе Еўраліга, не былі бязвоблачнымі, але да пэўнага моманту мы неяк зводзілі інтарэсы ў агульнае цэлае. Па-мойму, канфлікт пачаўся яшчэ з таго моманту, калі заснавальнікі «Камедзі Клаб» вырашылі, што ім трэба рухацца ў рэгіёны, і ў 2006 годзе дайшлі да Мінска. Афіцыйна кіраўніцтва КВЗ не каментуе гэта, неафіцыйна гучыць думка, што ігракам, якія ідуць у «Камедзі Клаб», трэба «перакрываць кісларод». Гэта, напрыклад, адбылося з беларускай камандай «Хнуся». На мяне асабіста быў вялікі ціск з боку рэдактараў Вышэйшай лігі МС КВЗ, каб не дапусціць каманду да ўдзелу ў чэмпіянаце. Але каманда сыграла ў фінале, а потым распалася, і зараз ігракоў няма, ёсць два новыя рэзідэнты «Камедзі». Мабыць, з таго моманту кіраўніцтва ТТА «АМіК» і вырашыла скінуць з пасады няўгоднага ім кіраўніка лігі, выкарыстоўваючы любую нагоду. Па крайняй меры, іншай прычыны я не бачу.

Каб высветліць пытанне з правамі на брэнд КВЗ — за выкарыстанне якога штогод даводзілася плаціць, беларусы звярнуліся ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці. Адтуль прыйшоў адказ аб існаванні двух таварных знакаў у класах «тэлевізійныя і шоў-праграмы» — «KVN KLOUB VESSELYKH I NAKHODTCHIVYKH» (зарэгістраваны ў 1998 годзе) і «Беларускі КВЗ» (у 2007 годзе). Менавіта брэнд «КВЗ» не зарэгістраваны і можа выкарыстоўвацца гэтак сама свабодна, як усе ўваходзячыя ў назву словы — «клуб», «вясёлыя», «і», «знаходлівыя».

Так што цяпер ужо МГА «Беларускі КВЗ» накіравала расіянам прэтэнзіі — каб у дасудовым парадку вярнуць грошы за карыстанне таварным знакам. Гэтаксама ў Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці зарэгістраваныя два знакі — «Беларускі КВЗ» і «Еўраліга» — для выкарыстання ў сімволіцы маладзёжнага аб'яднання, якое налічвае каля 2000 удзельнікаў. Зрэшты, працягу супрацоўніцтва з ТТА «АМіК» Андрэй Мукавозчык не выключае — але ўжо на зусім іншых умовах. А каб утрымаць у лізе моцныя каманды, якія могуць быць напалоханыя ўльтыматумам «АМіК» і перакінуцца ў наваствораную Палескую лігу, кіраўніцтва беларускага КВЗ збіраецца шукаць іншыя абходныя шляхі на «цэнтральныя расійскія тэлеканалы». «Гэты «мАскоўскі стыль» для мяне непрымальны і незразумелы, — каментуе падзеі Андрэй Мукавозчык. — Будзем абараняць сваіх ігракоў і каманды, а не станавіцца па першым вокрыку па стойцы «смірна». Мухі адляцяць, катлеты астынуць, а беларускі КВЗ, паверце, выжыве».

Пазіцыя **гендырэктара ЗАТ «АМіК» Навума Барулі** (апублікаваная на сайце www.amik.ru ў раздзеле «куток дырэктара» — **Аўт.**):

— Андрэй Мікалаевіч зрабіў закладнікамі ўсе каманды Еўралігі. Яму былі прапанаваныя вельмі карэктныя варыянты выхаду з канфліктнай сітуацыі. Мы выступалі катэгарычна супраць, каб вядучы Еўралігі, карыстаючыся сваім службовым становішчам, браў каманды Еўралігі з іх матэрыялам і рабіў тэлевізійную перадачу, якая не мае ніякага дачынення да КВЗ... У нас існуюць прэцэдэнты, калі мы, напрыклад, спачатку закрывалі, потым адкрывалі лігу ў Санкт-Пецярбургу — нас не ўсё задавальняла ў рабоце гэтай лігі. І гэтаксама нас не ўсё задавальняла ў адміністрацыйным кіраванні Еўралігі... Мы проста юрыдычна не захацелі ў гэтым годзе зноў заключаць дамову з арганізацыяй, якой кіруе Андрэй Мікалаевіч Мукавозчык.

Наконт зарэгістраваных таварных знакаў — чытай, брэнда «КВЗ» — масквічы абвясцілі, што «міжнародная іх рэгістрацыя адбываецца не ў Маскве і не ў Мінску, а ў Швейцарыі; дзеянне знака распаўсюджваецца на Расію, Азербайджан, Беларусь, Украіну, Літву, Латвію». І як быццам зарэгістраваны брэнд менавіта ў такім, міжнародным варыянце — KVN, — а правы на яго ўсё ж належаць ТТА «АМіК», таму, зразумела, ніякіх грошай за карыстанне знакам ніхто не верне.

«Гэта не значыць, што людзі павінны гуляць у КВЗ з нашага дазволу. Усе глядзяць на КВЗ па-рознаму — для адных гэта хобі, для другіх баўленне часу, а трэція хочуць выступаць у тэлевізійных лігах, — працягвае дырэктар ТТА «АМіК». — Калі ласка, мы нікому не забараняем гуляць у КВЗ, у тым ліку і спадару Мукавозчыку. Але трэба разумець, што для таго, каб выступіць у тэлепраграме КВЗ, трэба прайсці вялікі шлях, вучыцца, а вучыцца можна ў афіцыйных лігах ТТА «АМіК».

Акрамя таго, 29 студзеня гэтага года з'явілася новая рэдакцыя ўказа прэзідэнта МС КВЗ — таго самага, наконт удзелу КВЗшнікаў у «пабочных» тэлепраектах. Цяпер на **кожныя** здымкі каманды, што гуляюць у **любой** афіцыйнай лізе КВЗ, павінны браць дазвол у кіраўніцтва сваёй лігі і ТТА «АМіК». А ў выпадку дазволу ў гэтых тэлепраграмах **забараняецца** выкарыстоўваць матэрыял, які быў агучаны падчас гульняў у афіцыйных лігах МС КВЗ.

Рэдактары Вышэйшай лігі МС КВЗ (а адзін з іх, Леанід Купрыда, нагадаем, беларус, выходзец з каманды БДУ, і таму, па ідэі, павінен абараняць інтарэсы беларускіх камандаў) падкрэсліваюць: «Нам таксама вельмі крыўдна, бо ліга была адной з лепшых. І не трэба шукаць вінаватых у тым, што яе закрылі, трэба проста прааналізаваць свае ўласныя крокі. Мы лічым, няправільна браць КВЗшнікаў, якія толькі пачынаюць вучыцца гуляць у вялікі КВЗ, і рабіць з імі нейкія праекты. Мы лічым, што гэта шкодзіць іх творчаму шляху і развіццю. Што датычыцца новай неафіцыйнай Еўралігі, падраздзяленнем ТТА «АМіК» яна больш не з'яўляецца. І справа кожнай каманды, выбіраць — ехаць туды або не».

### Перамелецца?

Калі, дарагі чытач, ты лічыш, што на гэтым пастаўлена кропка, то глыбока памыляешся. Спрэчкі на ўсіх узроўнях працягваюцца, прыгадваюцца мінулыя крыўды і непаразуменні. А ўдзельнікі ўсё больш пераходзяць на асобы — адны саркастычна заўважаюць, што беларускім КВЗ збіраецца кіраваць «засланец» з «Камедзі Клаб», другія з'едліва парыруюць — спачатку навучыцеся пісаць без памылак, а потым раздасце ўказанні... «Вясёлая і знаходлівая» структура відавочна знаходзіцца ў крызісе — ці то агульная «матрыца, перазагрузка», ці то індывідуальнае процістаянне і перадзел сфераў уплыву (грошай?) абсалютна канкрэтных людзей.

Напрыканцы студзеня 2008 года ў Сочы каманды — былыя ўдзельніцы Еўралігі, выслухаўшы вердыкт кіраўніцтва, «пахавалі» і нават памянулі лігу. А ў Мінску тым часам плануецца правесці дзесяты, юбілейны «алімпійскі» сезон Еўралігі — ён жа адкрыты чэмпіянат Беларусі па КВЗ. Гульні яго стартуюць 10 і 11 лютага, а сярод удзельнікаў — 13 камандаў з Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі і Украіны. Абяцаюцца, акрамя запісу тэлеверсіі для беларускага Першага канала, новыя конкурсы, новыя адкрыцці, ранейшыя і новыя спонсары — словам, ніякай партызанскай вайны, звычайнае жыццё, з якога не грэх пасмяяцца. З 4 сакавіка, паводле папярэдніх звестак, пачнецца Кубак Еўралігі.

І вось гэта апошняя навіна, насуперак бясконцым віртуальным і рэальным «разборкам паноў», усяляе нейкі аптымізм. Значыць, КВЗ у нас будзе. Бо, як і ўсякае мастацтва, належыць народу. А хто і як будзе ўпарадкоўваць працэс — пакажа час.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Спорт-тайм

### На коне — сярэбраная чаша

Напярэдадні старту міжнароднага хакейнага турніру «Кубак Палесся-2008» старшыня Гомельскага гарвыканкама Аляксандр Бяляеў прадставіў журналістам галоўны трафей — чашу з 12 сегментамі-пласцінкамі, на якія будуць наносіцца назвы каманд-пераможцаў. Пасля поўнага запаўнення Кубак вернецца ў Гомель на пастаяннае захоўванне. Чашу на спецыяльны заказ зрабілі ювеліры Гомельскага вытворчага аб'яднання «Крышталь» з 4 кілаграмаў срэбра.

### Бага вярнуўся

Экс-абаронца барысаўскага БАТЭ і даўгаўпілскай «Даўгавы» Аляксей Бага падпісаў двухгадовы кантракт з брэсцкім «Дынама». Былы паўабаронца «Вераса» Фёдар Лукашэнка, які мае самы багаты вопыт выступлення ў вышэйшай лізе чэмпіянатаў Беларусі па футболе (350 матчаў), папоўніў склад магілёўскага «Савіта». Экс-ігрок мінскага «Дынама» і нясвіжскага «Вераса» Віталь Ледзянёў на правах вольнага агента перайшоў у ізраільскі клуб другога дывізіёна «Макабі» з Назарэта.

### Балельшчык падарыў футбалісту ...унучку?

Пасля чвэрцьфінальнага матча кубка Афрыкі супраць нігерыйцаў 82-гадовы футбольны балельшчык зборнай Ганы прапанаваў нападаючаму каманды Джуніёру Агога *(на фота)*, які забіў пераможны гол, сваю ўнучку-прыгажуню ў якасці падзякі за цудоўную гульню. Ігрок паабяцаў сустрэцца з дзяўчынай. Аднак на «гулі» ў яго мала часу: сёння адбудуцца паўфінальныя матчы. Нагадаем, што за выхад у фінал будуць спаборнічаць Гана — Камерун і Кот д'Івуар — Егіпет. Матч за трэцяе месца пройдзе ў суботу, галоўны паядынак — у нядзелю.



# На варце прыроды

**Летась падраздзяленнямі Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь выяўлена 2757 фактаў лесапарушэнняў, што на трэць больш, чым у 2006 годзе. Напрыклад, дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Лёзненскі лясгас», парушыўшы рэжым заказніка «Бабінавіцкі», на яго тэрыторыі правяла суцэльную высечку лясоў галоўнага карыстання, прыродным рэсурсам быў нанесены ўрон больш за 71 млн рублёў. Узбуджана крымінальная справа.**

Сельскагаспадарчым прадпрыемствам «Добрынскі» Шумілінскага раёна на землях сельскагаспадарчага прызначэння незаконна, без выпіскі лесарубнага білета, высечаны 2674 дрэвы розных парод, прыродным рэсурсам нанесены ўрон больш чым на 354 млн рублёў. Рашэннем суда пачаты працэс кампенсацыі шкоды.

Істотны таксама рост (на 336%) аб'ёму незаконна нарыхтаванай драўніны (2007 г. — 6359 $м^3$, 2006 г. — 1460 $м^3$).

Усяго работнікамі Дзяржінспекцыі ў паляўнічых угоддзях рэспублікі выкрыта 963 парушэнні Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, што складае 136 працэнтаў да ўзроўню 2006 г. (706). Канфіскавана 548 адзінак агнястрэльнай зброі (2006 г. — 330), у тым ліку 235 незарэгістраванай, 566 іншых прыладаў палявання, 5100 кг незаконна здабытага мяса дзічыны, што амаль у два разы больш, чым у 2006 г. (2600 кг).

Усяго работнікамі Дзяржінспекцыі ў 2007 г. выяўлены 431 выпадак крадзяжу сажалкавай рыбы, у тым ліку 339 у рыбаводных арганізацыях Мінсельгасхарча. У парушальнікаў канфіскавана і вернута рыбаводным арганізацыям больш за 4 тоны сажалкавай рыбы.

Выяўлена 10 фактаў гібелі рыбы ў выніку забруджання водных аб'ектаў неачышчанымі сцёкавымі водамі. Шкода, нанесеная рыбным рэсурсам, склала больш за 313 млн рублёў. Ва ўсіх выпадках устаноўлены вінаватыя суб'екты гаспадарання. У прымусовым парадку праз гаспадарчыя суды для пакрыцця шкоды, нанесенай рыбным рэсурсам, спагнана 60 млн рублёў. У добраахвотным парадку пакрываецца па частках 248 млн рублёў.

Усяго летась Дзяржінспекцыяй выяўлена 14,7 тысячы парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства (2006 г. — 12,8 тыс.).

**Віктар БЫКАЎ,**
**галоўны спецыяліст аддзела аналізу і апрацоўкі інфармацыі Дзяржінспекцыі.**

**УСП «УКС» ОАО «Электромодуль» совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион**

по продаже следующего имущества: ЛОТ № 1 — незавершенные строительством здания прирельсового склада (общ. пл. 235,2 кв.м) и проходной (13,6 кв.м), расположенных: г. Молодечно, ул. Любаво-Роменская. Площадь земельного участка — 0,9406 га. Нач. цена 115 000 000 бел. руб. с НДС; ЛОТ № 2 — трактор МТЗ-50, регистрационный знак 9288 БЭ. Нач. цена 5 706 899 бел. руб. с НДС; ЛОТ № 3 — бульдозер ДЗ-162-1. Нач. цена — 8 406 991 бел. руб. с НДС; ЛОТ № 4 — прицеп тракторный самосвальный 2ПТС-4, регистрационный знак 3985. Нач. цена 3 273 122 бел. руб. с НДС; ЛОТ № 5 — сушилка СПВ-62. Нач. цена — 10 469 507 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с, указанный в Условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект осуществляется в течение 7 рабочих дней после окончания торгов. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 11.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

## ЦІ ДАЛУЧАЦЬ МІНСКІ РАЁН ДА СТАЛІЦЫ?

**У бліжэйшы час Мінскі гарвыканкам прадставіць заключэнне наконт мэтазгоднасці перадачы зямель Мінскага раёна ў сталічнае падпарадкаванне.**

Паводле слоў намесніка начальніка Мінскай гарадской землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службы Людмілы Пархомчык, работа была праведзена згодна з даручэннем урада. «У прыватнасці, камітэты эканомікі, архітэктуры і горадабудаўніцтва разглядалі гэтае пытанне з розных бакоў. Яно патрабуе вельмі глыбокай распрацоўкі, бо Мінскі раён па сутнасці аграрны, ён складаецца з 13 сельскіх Саветаў», — патлумачыла яна.

Як лічаць спецыялісты, аб'яднанне пойдзе на карысць абедзвюм адміністрацыйным адзінкам. Палепшыцца экалогія, больш рацыянальна можна будзе выкарыстоўваць тэрыторыю. Паводле прыкладу сусветных сталіц, Мінск паступова ператвараецца ў мегаполіс. З іншага боку, трэба ўлічыць і інтарэсы гаспадароў прысядзібных участкаў, якія размеркаваны па ўсёй тэрыторыі Мінскага раёна. Як паўплывае на іх гэта далучэнне?

**Аляксандр ВАЛЯНЦІНАЎ.**

## З ПРАГУЛКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*г.п. Кіраўск*

**6 лютага пайшоў з жыцця заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь, спецыяліст-практык у галіне макраэканамічнага рэгулявання і прагназавання, фінансаў і крэдыту, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР Філіп Лаўрэнцьевіч КОХАНАЎ.**

**Філіп Лаўрэнцьевіч Коханаў нарадзіўся 9 кастрычніка 1911 г. у мястэчку Мілаславічы Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні ў сям'і селяніна. Пасля заканчэння ў 1936 годзе Беларускага інстытута народнай гаспадаркі да 1941 года працаваў на кіруючай пасадзе ў Наркамаце фінансаў БССР. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны актыўна ўдзельнічаў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, быў кантужаны.**

**У 1946 годзе быў назначаны намеснікам міністра фінансаў, з 1951 г. — міністрам фінансаў БССР, са снежня 1965 г. — намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР і Старшынёй Дзяржплана.**

**За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. і за працоўныя поспехі ў аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі, плённую працу ў фінансавых і планавых органах Філіп Лаўрэнцьевіч Коханаў быў узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнамі Вялікай Айчыннай вайны І і ІІ ступеняў, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, ордэнам «Знак Пашаны» і 11-ю медалямі.**

**Светлы вобраз Філіпа Лаўрэнцьевіча назаўсёды застанецца ў памяці людзей, якія мелі шчасце ведаць яго і працаваць побач.**

**Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь смуткуе з прычыны смерці Філіпа Лаўрэнцьевіча Коханава і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

Прамая лінія

# РАЗ КАШТОЎНАСЦЬ, ДВА КАШТОЎНАСЦЬ...

**Дзяржаўны спіс беларускіх гістарыка-культурных каштоўнасцяў, які існуе амаль два дзесяцігоддзі, сёння налічвае 4710 адмысловых аб'ектаў і пастаянна папаўняецца. Летась у ім з'явілася 10 новых пунктаў, падрыхтаваны і электронны варыянт пераліку. Вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны — скарбніцы кожнай краіны — вельмі важна і для сучаснікаў, і для нашчадкаў, бо народ, які ведае і шануе нацыянальнае багацце, захоўвае сваю самабытнасць. Якія ж здабыткі і цяжкасці на гэтым шляху ў Беларусі, высвятлялі на Беларускім радыё разам з госцем «прамой лініі» — Ігарам ЧАРНЯЎСКІМ, намеснікам начальніка Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры. Весці праграму ў студыі радыёжурналісту Максіму Угляніцу дапамагала карэспандэнт «Звязды».**

***— Ігар Мяфодзьевіч, паводле якіх крытэрыяў аб'екты ўключаюцца ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў?***

— У Законе «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» ёсць адпаведны артыкул, які вызначае крытэрыі адбору аб'ектаў. Натуральна, што гэтыя крытэрыі можна прымяніць як да каменю ў полі, які звязаны з пэўнымі знакавымі падзеямі або мае значэнне з пункту гледжання геалогіі, развіцця нашай зямлі, так і да складанага архітэктурнага комплексу. За любым з такіх аб'ектаў павінны стаяць нейкія адметныя з'явы, якія вызначаюць неабходнасць надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Мы ацэньваем, параўноўваем аб'екты, вылучаем нейкія тыпалагічныя рады, скажам, у шэрагу помнікаў, аднаго перыяду, аднаго стылю. Відавочна адбіраюцца найбольш знакавыя па сваіх мастацкіх якасцях і гістарычным кантэксце помнікі.

Літаральна днямі мы разам з супрацоўнікамі музея Вялікай Айчыннай вайны абмяркоўвалі, якім з узораў ваеннай тэхнікі надаваць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Узоры гэтыя выяўлены, адрэстаўраваны або рэстаўруюцца шклоўскім ваенна-патрыятычным клубам «Пошук». Адзін з такіх узораў — танк БТ-7 — баявая машына пачатку Вялікай Айчыннай вайны (1930-ых гадоў выпуску). З аднаго боку, гэта серыйны выпуск, а з другога — адзіны ў Беларусі дзеючы ўзор такой ваеннай тэхнікі. Танк, які сустрэў гітлераўскае нашэсце. Не выключана, што пры больш глыбокім даследаванні высветліцца, што за гэтым танкам стаяць пэўныя ваенныя падзеі: магчыма, абарона Дняпроўскага рубяжа, паколькі ён якраз быў знойдзены на Падняпроўі.

Праца над такімі аб'ектамі ідзе пастаянна. І да вызначэння (згодна з заканадаўчымі крытэрыямі) статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці прыцягваюцца розныя спецыялісты ў залежнасці ад характару аб'екта, які разглядаецца. Напрыклад, для надання статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці патрэбны ўдзел спецыялістаў у сферы народнай творчасці — фалькларыстаў, этнографаў. Гэта зараз асабліва актуальна, бо апошнім часам адбыўся пэўны перакос у бок матэрыяльнай спадчыны, а вось нашы песенныя, танцавальныя, абрадавыя традыцыі прадстаўлены недастаткова, і зараз мы ставім перад сабой задачу больш актыўна папрацаваць у плане разгляду нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека.

***— Наколькі актыўна змяняецца Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў?***

— Спіс папаўняецца вельмі дынамічна, і звязана гэта з актыўнай працай спецыялістаў у гэтай сферы: гісторыкаў архітэктуры, архітэктараў, археолагаў і іншых, якія ў працэсе сваіх даследаванняў выяўляюць аб'екты, што патэнцыяльна могуць увайсці ў спіс. Зараз якраз рыхтуецца праект пастановы Савета Міністраў аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці яшчэ прыблізна двум дзесяткам аб'ектаў. Але гэта не значыць, што ідзе работа толькі па ўключэнні новых, выяўленых за гэты перыяд аб'ектаў або ўжо раней вядомых, якія былі дасканала прааналізаваны. Робяцца і пэўныя папраўкі да ўжо прызнаных аб'ектаў — праца ж па іх не спыняецца: праводзяцца даследаванні, з'яўляюцца новыя звесткі, магчымыя нават такія банальныя змены, як удакладненне адрасоў у сувязі з перайменаваннем вуліц, зменай назваў населеных пунктаў і гэтак далей. Ці вось працягваецца вялікая і сур'ёзная праца па інвентарызацыі археалагічных аб'ектаў — відаць, адных з найбольш складаных у плане аховы і захавання.

***— Каму адрасавана электронная версія спісу?***

— Электронная версія ўжо сёння знаходзіцца ў шырокім доступе — яе можна знайсці на некалькіх Інтэрнэт-сайтах, у прыватнасці, на сайце Міністэрства культуры (www.kultura.by), таму любы ахвотнік можа з ёю азнаёміцца. Аднак у першую чаргу мы задумвалі яе для спецыялістаў мясцовых органаў кіравання. Выпушчаны дыскі, на якіх, акрамя самога Дзяржаўнага спісу, ёсць папка з усёй заканадаўчай базай, што рэгулюе пытанні аховы спадчыны: гэта не толькі Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», але і іншыя 17 актаў заканадаўства — адпаведныя ўказы Прэзідэнта, пастановы Савета Міністраў, Міністэрства культуры і іншыя. Яны рэгулююць самыя розныя пытанні, пачынаючы з афармлення і рэгістрацыі ахоўнага абавязацельства або ўстаноўкі ахоўнай дошкі на аб'екце да распрацоўкі навукова-праектнай дакументацыі па аб'ектах ці працэдуры перамяшчэння культурных каштоўнасцяў праз мытную мяжу Беларусі.

***— Як вы ставіцеся да меркавання, што любы аб'ект пасля таго, як прайшло 100 гадоў, можа з'яўляцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю?***

Высветліць гэта дапамагаюць тыя крытэрыі, якія закладзены ў нашым заканадаўстве, таму што далёка не ўсе аб'екты нават аднаго перыяду, стылю ці агульнай мастацкай, архітэктурнай традыцыі павінны быць уключаны ў Дзяржаўны спіс, хоць як патэнцыяльныя аб'екты, якія выклікаюць інтарэс, яны такімі з'яўляюцца. Скажам, на сёння каля 170 гістарычных сядзіб у розных рэгіёнах нашай краіны ўключаны ў Дзяржаўны спіс, хоць некаторыя з іх у натуры сваёй (сядзібныя будынкі, гаспадарчыя пабудовы) не захаваліся, як, напрыклад, ва Убелі, звязанай з жыццём і творчасцю Станіслава Манюшкі. Аднак нават сама тэрыторыя, дзе некалі размяшчалася гэта сядзіба, павінна быць адзначана ў Дзяржаўным спісе, і трактавацца як пэўны гістарычны аб'ект, цікавы не толькі для народа Беларусі, але і для нашых суседзяў — палякаў, літоўцаў. Ці, скажам, месца, дзе размяшчаўся дом, у якім нарадзіўся Максім Багдановіч. Несумненна, сам факт нараджэння класіка беларускай літаратуры ў Мінску павінен быць зафіксаваны і пэўным чынам адзначаны ў горадзе, калі і не аднаўленнем самога дома (там зараз іншая будаўнічая сітуацыя і можа аказацца складана аднавіць менавіта той будынак), то ва ўсякім разе якім-небудзь памятным знакам, пэўным пазначэннем у сістэме добраўпарадкавання тэрыторыі.

***— Якія аб'екты зараз найбольш прыярытэтныя для рэстаўрацыі і якіх фінансавых выдаткаў гэта вымагае?***

— Аб'екты гэтыя ва ўсіх на слыху — гэта сапраўды буйныя праекты, якія патрабуюць дастаткова вялікіх аб'ёмаў фінансавання. Помнік 1930-ых гадоў, узор канструктывізму, — будынак Тэатра оперы і балета, распрацаваны знакамітым архітэктарам Іосіфам Лангбардам. Спецыялісты дыскутавалі наконт таго, у якім выглядзе аднаўляць будынак і прыйшлі да высновы, што важна захаваць тую першаасноў, закладзеную самім Лангбардам, як цікавы, адметны для нашай гісторыі архітэктуры помнік. Не менш прыярытэтныя аб'екты — Мірскі і Нясвіжскі замкі. У Нясвіжы летась быў здадзены першы пускавы комплекс. Зараз там фактычна ідзе працэс фарміравання экспазіцый у гэтых першых памяшканнях, каб у самы блізкі час наведвальнікі маглі зайсці ўнутр замка. Працы працягваюцца на так званых Камяніцы, Палацы, Арсенале — гэта ўжо наступныя этапы ўводу ў эксплуатацыю ўнікальнага для нас і для ўсяго свету збудавання, які ў складзе іншых нясвіжскіх аб'ектаў уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Мірскі замак таксама блізкі да завяршэння.

Наогул у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў, прынятай яшчэ ў 2002 годзе, вызначаны 50 прыярытэтных аб'ектаў. На некаторых з іх працы ўжо праведзены і яны выкарыстоўваюцца, скажам, здадзены пад музейную функцыю, як напрыклад, Гомельскі палац — дарэчы, паводле ацэнак спецыялістаў, рэстаўрацыя была надзвычай удалай. Пасля завяршэння іншых праектаў, урадавыя дакументы, відавочна, будуць перагледжаны, з тым, каб папоўніць іх новымі аб'ектамі, якія патрабуюць увагі. Зараз жа працягваюцца працы на Магілёўшчыне — Жыліцкі палацавы комплекс, капліца ў вёсцы Лясная. Шмат чаго аднаўляецца на Гомельшчыне: былы езуіцкі калегіум у Юравічах, сядзібны дом у вёсцы Чырвоны Бераг — унікальны па сваіх мастацкіх асаблівасцях, на Гродзеншчыне — Лідскі замак, які і сёння актыўна выкарыстоўваецца мясцовымі органамі кіравання як пляцоўка для правядзення фестываляў, вечарын. У самім Гродне сёння распрацоўваецца праектная дакументацыя па Старым замку, хоць яна і была падрыхтавана на стадыі архітэктурнага праекта яшчэ ў 1994 годзе, але, тым не менш, неабходна ўдакладненне, вылучэнне чарговасці аб'ектаў, каб праводзіць працы паэтапна. Спецыялісты працуюць таксама над Каложскай царквой, комплексам Палаца адміністратара ў Гродне. Усе гэтыя праекты фінансуюцца за кошт сродкаў як рэспубліканскага, так і мясцовых бюджэтаў. Напрыклад, у згаданым Гомельскім палацы працэнтаў 70 ад агульнага аб'ёму фінансавання складаюць сродкі абласнога бюджэту.

*(Заканчэнне будзе.)*

**Падрыхтавала Ала МАЧАЛАВА.**

**Мінскі абласны выканаўчы камітэт выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама Каршакевіч Валянціне Мікалаеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — трагічнай смерцю ДАЧКІ.**

# ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ




## ПЯТРО І ПРАЎДА

Ён казаў, і яму верылі. Ён шмат гаварыў і гаварыў, а яму верылі і верылі. Ён пачаў ілгаць, а яму верылі, бо зрэдчас ён прагаворваў праўду. Ён стаў столькі лгаць і падманваць, столькі падманваць ды лгаць, што страціў усялякі давер. Цяпер ён зрэдку спрабуе сказаць праўду. Хто паверыць? Ніхто.

## ЛАБРУЕР І СУМЛЕННЕ

У кнізе «Характары, альбо Норавы сучаснага стагоддзя» мараліст Жан дэ Лабруер піша: «Разумны, сумленны і прастадушны чалавек з вялікай верагоднасцю можа трапіць у пастку: яму і ў галаву не прыйдзе, што некаму заманецца злавіць яго на памылцы і ператварыць у пасмешышча... « Я не буду пытацца пра тое, дзе Лабруер бачыў разумнага, сумленнага і ў той жа час прастадушнага чалавека. Паверу маралісту. А вось у тое, што разумны чалавек не ведае, як людзей ловяць на памылках і выстаўляюць на ўсеагульны смех, паверыць не змагу. Большасць літаратараў якраз толькі тым і займаюцца, што высмейваюць чалавечыя заганы, бо яны цудоўна ведаюць, што за маскамі прастадушша і сумлення якраз і хаваюцца грахі чалавечыя.

## ЖАНЧЫНА І САБАЧКА

Побач з жанчынаю бег сабачка такога памеру, што яго не палохаліся нават вераб'і.

## КАРАВАЙ І ПЕСНЯ

Яна была ўся кругла-круглая, і прозвішча мела круглае — Каравай. Мы выпівалі ўтраіх у паэта Сыса. Выпівалі і спявалі песеньку: «Каравай, Каравай, каго хочаш выбірай! Выбераш, вядзі у рай... Каравай, Каравай...» І спявалі мы тую песеньку бясконца, бо Каравай падабаўся Сыс, мне падабалася Каравай, а Сысу падабалася гарэлка. Песня круцілася і круцілася, пакуль Каравай не запусціла магнітафон, у якім загучала песня пра сон у трамваі. Каравай сказала, што гэта яе любімая песня, я абвясціў, што песня напісалася на мае вершы, спадзеючыся, што Каравай узрадуецца і... «Не мог ты такую песню напісаць! Я цябе даўно ведаю, ты — паскудны чалавек, а паскудны чалавек не можа напісаць добры верш!!!» Сыс мяне бараніў, казаў, што верш пра сон у трамваі адназначна мой. І чым больш ён мяне хваліў, тым больш злавалася Каравай. Яе вялікія круглыя вочы рабіліся яшчэ большымі і круглейшымі, я выдатна памятаю, як яе вочы паввялічваліся і павялічваліся, а больш нічога, забі, не помню.

## АСТРАШЭЎСКІ І ЦВЯРОЗАСЦЬ




Саша Астрашэўскі гаспадарыць у барах і рэстарацыях. Іх у яго шмат — «Стары Менск», «Лондан», «Грунвальд», «Пціч» і «У бабулі». Каб спраўна разліваць людзям гарэлку, трэба самому быць цвярозым. Таму і гутарку пра кіданне піць я завёў з Аляксандрам Альбертавічам. «Кінуць піць зусім і не цяжка, — разважаў Альбертавіч. — Цяжка прыдумаць сабе цвярозае жыццё!» Сапраўды, так. Мала хто з нас сам сабе прыдумляе работу, зазвычай людзі спадзяюцца, што нехта мудры прыдумае працу за іх і скажа, што, дзе і калі зрабіць, а за зробленае заплаціць грошы. Пасля працы з тымі грашыма чалавек трапляе ў краму, а там... Ну што можа быць лепшым для мужчыны за пляшку гарэлкі? Тут трэба думаць, тут варта спыніцца і задумацца. Тут і трэба прыдумаць сабе цвярозае жыццё, а яно не прыдумляецца, а гарэлка зусім побач, а яна кліча і вабіць. Купляеш бутэльку, п'еш, засынаеш, прачынаешся, становішся пад душ і зноўку ідзеш на працу. Кола замыкаецца. Жыццё цячэ, як тая гарэлка з рыльца. Ты, як і ўсе. Ці патрэбна табе тое іншае жыццё без гарэлкі? Мне яно спатрэбілася, я прыдумаў сабе жыццё з маляваннем аголеных натуршчыц, пісаннем хайку і нататак пра сучаснікаў, чытаннем кніжак і любоўю да іншых людзей. Каб некага любіць, трэба быць цвярозым. А да Аляксандра Альбертавіча я заходжу кавы папіць і пагаварыць пра літаратуру.

## АРЫСЦІП І БУРА

Лягчэй развітацца з жыццём нікчэмным і поўным бяды, чым з жыццём шчаслівым. Гэта заўважыў Арысціп, калі патрапіў на караблі ў буру. Страх згубіць шчасце, большы за страх страціць малапатрэбнасць, гэта хоць нейкая, а кампенсацыя прыніжаным і пакрыўджаным за іх пакутлівае жыццё.

## ВІТАЛЬ І ГАЎБЕЦ

Віталь мае самы найлепшы гаўбец у горадзе. Пагадзіцеся, атрымаць у спадчыну добры гаўбец не так і мала. Бацька ў Віталя быў архітэктарам, ён сам і спраектаваў дом, а гаўбец стаў вяршыняю ягонай творчасці. Той, хто не далюбліваe наш сталічны ампір, можа паспрачацца з Віталем, можа прыйсці ў скверык, дзе стаіць бронзавая дзяўчынка з падраным парасонам, задраць галаву, ацаніць гаўбец і распачаць спрэчку. Я спрачацца з Віталем не буду, бо калі чалавек лічыць свой гаўбец найвыдатнейшым, яму бессэнсоўна пярэчыць. Больш за тое, Віталь на маіх вачах здзейсніў подзвіг. Можна па-рознаму трактаваць слова «подзвіг», але я лічу ўчынак Віталя подзвігам. Стоячы на сваім гаўбцы, Віталь вырашыў нічога не рабіць. Працаваў Віталь архітэктарам у рэстаўрацыйных майстэрнях. Яму захацелася паставіць эксперымент: нічога не рабіць і атрымліваць заробак. Віталь прыходзіў у майстэрні і зусім нічога не рабіў. Першыя два тыдні ніхто нават не заўважыў, што адзін чалавек не працуе. Потым заўважылі, пачаліся розныя размовы, дайшло да пагрозаў і скаргаў, а калі сам дырэктар выклікаў Віталя, каб звольніць, толькі тады эксперыментатар і распавёў праўду пра свае паводзіны. Не працаваў ён роўна 52 дні. На агульным сходзе рэстаўратары прызналі ўчынак Віталя за мастацкі жэст і даравалі яму такую лайдакоўскую выхадку. Зразумела, што ніхто больш не змог у рэстаўрацыйных майстэрнях прагуляць нават адзін дзень, бо ўсе цяперака пільна сачылі за працаздольнасцю сваіх калегаў. А ўсё дзякуючы Віталю, ну і гаўбцу, на якім прыйшла геніяльная ідэя здзейсніць антыпрацоўны подзвіг.

## ІГАР І ГАРШЧОК

Ігар запрасіў мяне ў майстэрню і пачаў паказваць велізарныя палотны, на якіх ён спрабаваў намаляваць Бога. Цяжкае было відовішча. «Падабаецца?» — наўпрост запытаў Ігар. «Падабаецца...» — адказаў я, і не стаў удакладняць, што менавіта мне спадабалася. А спадабаўся мне чырвоны гаршчок. Я ўважліва агледзеў усю майстэрню і нічога мастацкага ў ёй не знайшоў, акрамя старога гліянага гаршка з новымі пэндзлямі.

**Адам ГЛОБУС.**

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (6 лютага). Па гарызанталі:** Піраміда. Казак. Зебу. Амар. Жарт. Эра. Раса. Ярмо. Мат. Скіф. Брыгада. Рак. Поза. Агат. Сава. Кактус. Завал. Унікум. Піла. Ягдташ. Кока. Ляп. Асадак. Акра. Нядоля. Адам. Хна. Барханы. **Па вертыкалі:** Гардэроб. Аазіс. Ястык. Вал. Авал. Марс. Ясень. Асада. Кляп. Піке. Такса. Алдан. Абат. Кадык. Ода. Розум. Рала. Аер. Ямб. Кар. Суша. Пост. Паніка. Эпілог. Код. Зарука. Караван. Лат. Макароны.

## Усміхнёмся!

Вовачка прыйшоў у школу вельмі бледны. Настаўніца:

— Ты захварэў?

— Не, мяне мама ўчора памыла.

☺

**Запіска мужу.**

**«Любы, калі ты прыедзеш, ты будзеш моцна галодны, таму я вырашыла зрабіць табе сюрпрыз. Вячэра на стале! Прыходзь хутчэй, я цябе вельмі-вельмі чакаю! Стол у рэстаране».**

☺

Віні-Пух прыбягае да Пятачка:

— Пятачок, там нам 20 бляшанак варэння прыйшло, па 18 кожнаму!

— Як гэта можа быць па 18, калі ўсяго 20?

— Не ведаю, але свае 18 я ўжо з'еў!

☺

**Тэатральныя навіны.**

**Хударлявую балярыну, якая атрымала з глядацкай залы паветраны пацалунак у адказ, знесла ветрам са сцэны.**

☺

Дзве жанчыны выбіраюць паштоўкі для любімага на Валянцінаў дзень. Адна другой:

— Глядзі, якая прыгожая з надпісам «Майму коціку!». Купіць хіба свайму казлу?..



## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.47 | 17.01 | 9.14 |
| Віцебск — | 7.41 | 16.47 | 9.06 |
| Магілёў — | 7.37 | 16.51 | 9.14 |
| Гомель — | 7.29 | 16.53 | 9.24 |
| Гродна — | 8.01 | 17.17 | 9.16 |
| Брэст — | 7.57 | 17.23 | 9.26 |

**Месяц**

*Маладзік 5.45.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Анатоля, Віталя, Майсея, Піліпа, Пятра, Рыгора, Селівана, Уладзіміра, Фелікса;*
***К.*** *Рамуальда, Рышарда, Тодара.*




## 7 лютага

*Дзве даты*



**1823 год** — выйшаў указ імператара Аляксандра I, згодна з якім жыхарам Беларусі і Літвы забаранялася накіроўваць дзяцей на вучобу ў замежныя ўніверсітэты.

**1992 год** — міністры замежных спраў 12 краін падпісалі ў Маастрыхце дагавор аб стварэнні Еўрапейскага саюза.

*Цытата дня:*

***«Самая рэдкая рэч, якую толькі можна знайсці на Зямлі, — гэта па-сапраўднаму справядлівы чалавек».***
**Джэймс Фенімор Купер (1789—1851), амерыканскі пісьменнік.**

Новы прэпарат

## ДЫЯСІНОЛ дапаможа суставам

**У аптэчную сетку рэспублікі паступіла чарговая арыгінальная распрацоўка УП «Дыялек» — прэпарат дыясінол, прызначаны для лячэння розных хвароб суставаў.**

Паводле слоў навуковага кансультанта завода кандыдата біялагічных навук Людмілы Пленінай, эфектыўнасць дадзенага прэпарата абумоўлена выкарыстаннем вадакрышталічных злучэнняў, падобных сваім складам на тыя, што ёсць у натуральнай змазцы суставаў. Клінічныя і постклінічныя даследаванні пацвердзілі эфектыўнасць дыясінолу, здольнага ўзнаўляць пашкоджаны каленны храсток. Стан хворых на астэартрыты паляпшаецца літаральна пасля 5—7 аплікацый лячэбнага сродку. Праходзяць запаленне, суцішаецца боль, павялічваецца рухомасць сустава. Прэпарат можа выкарыстоўвацца і падчас траўматычных артрытаў у тых жа спартсменаў. Як і ўся іншая прадукцыя «Дыялека» вышэйпамянёная распрацоўка выраблена з натуральнай сыравіны і таму не мае пабочных эфектаў. УП «Дыялек» вылучаецца на фармацэўтычным рынку краіны распрацоўкай і вырабам лекаў і біялагічна актыўных дабавак да ежы з экалагічна чыстай натуральнай раслінай і жывёльнай сыравіны.

**Уладзімір КАРПУК.**

## Факт

### У Гродне на пешаходных пераходах паблізу школ з'явяцца стопмэны

**Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік упраўлення ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама Мікалай Карабан.** Стопмэны — спецыяльна абучаныя людзі з ліку настаўнікаў або старшакласнікаў — дапамагаюць вучням малодшых класаў бесперашкодна перайсці дарогу, прыпыняючы для гэтага рух транспарту. У 2007 годзе для прафілактыкі дарожнага траўматызму некаторыя школы Гродна і Ліды эпізадычна ўжо выстаўлялі стопмэнаў.

## Крымінал, здарэнні

### СПАКУСІЎСЯ КАПІТАН НА ХАБАР

**Размова пойдзе пра інспектара — інжынера аддзела сродкаў і сістэм аховы Цэнтральнага аддзела дэпартамента аховы МУС, што ў Гомелі.**

Як паведаміла нам прэс-група УКДБ па Гомельскай вобласці, ён, капітан міліцыі, падбіў на хабар у суме 429 тысяч рублёў аднаго грамадзяніна, якому патрэбна было зрабіць аўтаномную устаноўку ахоўнай сігналізацыі «па блату». Узбуджана крымінальная справа.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### БАЦЬКА З СЫНАМ ЗАТРЫМАЛІ БРАКАНЬЕРАЎ

**У Барысаўскую міжрайінспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету паступіла паведамленне з мясцовага РАУС пра здабычу рыбы на рацэ Сха з дапамогай электралавільнага прыстасавання.**

Калі дзяржінспектары выехалі на месца, там ужо працавала следча-аператыўная група. Было ўстаноўлена, што мясцовы жыхар са сваім сынам заўважылі і затрымалі двух парушальнікаў. Канфіскавана памянёнае прыстасаванне, рыба вагой каля 14 кілаграмаў, гумавая лодка. У дачыненні да затрыманых — непрацуючага і аператара ААТ «Барысаўскі ДАК» — дзяржінспектарамі складзены адміністрацыйныя пратаколы. Адзін з затрыманых, як высветлілася, ужо трапляў у поле зроку інспектараў: у 2003 годзе за знаходжанне паблізу вадаёма з забароненымі прыладамі рыбалоўства (сеткамі) быў аштрафаваны на 14 тысяч рублёў, у 2006 годзе за здабычу рыбы сеткай — на 620 тысяч рублёў. Барысаўскім РАУС разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ШТО БЫЛО НА ДАЧЫ...

**Тое і ўкралі. А менавіта: музычны цэнтр, пыласос, пральную машыну, электрапліту і два тэлевізары.**

Усё гэта захоўвалася ў дачным доміку аднаго жыхара Санкт-Пецярбурга, які аблюбаваў вёску Перадавая, што ў Рагачоўскім раёне, для адпачынку. Калі ж ад гарадскога тлуму ў чарговы раз ён заявіўся сюды, то і выявіў гэтую прапажу.

Шчыра кажучы, чалавек ужо і не спадзяваўся на тое, што рэчы ўдасца знайсці. Але, як паведамілі нам у прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама, міліцыя выявіла зламысніка. Ім аказаўся раней судзімы жыхар суседняй вёскі. Яго арыштавалі, а рэчы вярнулі гаспадару.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* **№ 4 (255)**

## Пах вясны

**Менавіта ў лютым і людзі, і расліны, і жывёлы адчуваюць, што зіма ўсё ж хутка скончыцца. Расліны набіраюцца сілаў для фарміравання лісця і кветак. З улікам усяго гэтага і трэба планаваць свае работы садаводам, агароднікам, пчалярам.**

У фазе вымушанага спакою пры працяглых адлігах аднаўляецца працэс развіцця кветкавых пупышак. У гэты час сонечнае награванне ствала дрэў можа справакаваць пачатак вегетацыі кары, а начныя халады — яе адміранне ў выніку страты загартоўкі. Утвараюцца сонечна-цеплавыя апёкі, прычынай якіх з'яўляецца і моцная ўльтрафіялетавая радыяцыя. Асабліва гэта небяспечна для дрэў, з якіх зімовыя дажджы змылі восеньскую пабелку. Цёмныя ствалы гэтых дрэў днём мала адбіваюць сонечнай энергіі, прыкметна награваюцца. Ад моцнага начнога пахаладання вада, якая трапіла ў невялікія шчыліны, замярзае і разбурае кару. Каб гэтага не дапусціць, ужо ў лютым аднавіце пабелку ствалоў і галін. Рабіць гэта трэба пры тэмпературы не ніжэй за мінус пяць градусаў. Пры магчымасці рэкамендуецца апырснуць вапнавым растворам і ўсю крону. Для лютаўскай і сакавіцкай пабелкі, гэтак жа як і для восеньскай, раствор гатуецца наступным чынам: у 10 л вады разводзяць 2—2,5 кг свежагашанай вапны і дадаюць 0,4—0,5 кг меднага купарвасу, папярэдне раствoранага ў вадзе. Для таго каб вапнавы раствор лепш прыліпаў да ствалоў, дадаюць 1—2 шклянкі малака.

Калі на градцы суніц садовых стаіць вада, трэба зрабіць так, каб яна сцякала, і карані не гінулі ад недахопу кіслароду ў выпадку ўтварэння лёду, а самі суніцы, там дзе няма снегу, уцяпліць сухім торфам ці саламянай рэзкай або сухой травой.

У першай дэкадзе лютага ў пакоі або ў цяпліцы высяваюць насенне памідораў на расаду для веснавых цяпліц, у канцы лютага сеюць на расаду для адкрытага грунту насенне сельдэрэю.

У сярэдзіне або ў канцы лютага яшчэ раз карысна праверыць, як захоўваюцца бульба і агародніна, хворыя і гнілыя асобіны выкінуць. Нядрэнна паглядзець, як захоўваюцца квашаная і салёная капуста і агуркі. Калі з'явілася плесня на кружках, яе трэба змыць.

У лютым трэба канчаткова падлічыць, ці дастаткова нарыхтавана ўгнаенняў і закуплена ядахімікатаў, дазволеных для аховы раслін ад шкоднікаў і хвароб.

У гэтым месяцы трэба дакладна вызначыць, колькі і якіх агародных культур вы будзеце вырошчваць вясной, летам і ўвосень на агародзе, у цяпліцы, пад плёнкай. Праверыць, ці дастаткова ў вас насення, пры недахопе закупіць нават з запасам.

## Жыццё насення

**Цяпер самы час паклапаціцца пра насенне. Ні ў якім разе нельга выкарыстоўваць для сяўбы насенне дэфармаванае, дробнае ў параўнанні са звычайным той ці іншай расліны, таму што яно можа быць крыніцай многіх захворванняў.**

Для сяўбы трэба выбіраць здаровае, раўнамерна афарбаванае насенне, атрыманае, напрыклад, у мінулым годзе. Але не ўсё мінулагодняе насенне прыдатнае для сяўбы. Напрыклад, насенне сямейства гарбузовых дае лепшы ўраджай не мінулагоднняе, а сабранае гады два назад і пазней. Зрэшчы, звярніце ўвагу на табліцу.

**Колькі «жыве» і дае паўнацэнны ўраджай насенне**

| | |
|---|---|
| Баклажан, перац салодкі, салата, крэс-салата, пятрушка, гарох, шчаўе, цыбуля рэпчатая, мацярдушка | 3—4 гады |
| Бручка, капуста белакачанная | 4—5 гадоў |
| Буракі сталовыя, капуста ліставая, фасоля агародная | 5—6 гадоў |
| Гарбузы, кабачок, патысон, агуркі, кавун | 6—8 гадоў |
| Морква, цыбуля-батун, цыбуля-парэй | 3—5 гадоў |
| Пастэрнак, эстрагон | 1—2 гады |
| Радыска, рэдзька, рэпа, таматы | 5—7 гадоў |
| Сельдэрэй, кроп, мята, маяран, цыбуля-шніт | 2—3 гады. |

**Сакрэты ўраджаю:**

- Морква звычайна прарастае паміж 10—18-м днём пасля сяўбы. Паскорыць усходы дзён на 5—7 можна, калі насенне загарнуць у шчыльную тканіну і ў такім выглядзе закапаць ў зямлю на глыбіню 10—15 см, патрымаць ад 7 да 10 дзён.
- Насенне кабачкоў, агуркоў, патысонаў, гарбузоў прарошчваюць у вільготным пілавінні. Папярэдне яго ашпарваюць кіпенем, потым астуджваюць. Насенне ў пілавінне кладуць на 2—3 дні.
- Пры працяглым захоўванні насенне таматаў, баклажанаў і перцу можа страціць усходжасць. Каб абудзіць іх да жыцця, пакладзіце насенне ў мяшочкі і апусціце ў ваду, нагрэтую да 50—60 градусаў. Таматы трымайце так 1,5—2 гадзіны, перац і баклажаны — 2. Потым загарніце іх у шчыльную тканіну, складзеную ў некалькі слаёў, пакладзіце ў поліэтыленавы пакет і трымайце ў цяпле пры тэмпературы 25—30 градусаў да праклёўвання. Насенне гібрыдаў праграваць не варта.

## Каляндар некаторых садова-агародных работ у лютым

***Дні, неспрыяльныя для пасеву і пасадкі любой культуры***

7, 20, 21

***Спрыяльныя дні***

| *Віды работ, культура* | *Дні месяца* |
|---|---|
| Баклажаны | 8, 9, 16, 17 |
| Буракі сталовыя | 3—5, 23—27 |
| Капуста ранняя | 8, 9, 12—14, 17, 18 |
| Кроп | 14—18 |
| Морква | 23—27 |
| Перац салодкі | 8—9, 17—18 |
| Пятрушка ліставая | 8, 9, 12—18 |
| Пятрушка каранёвая | 3—5, 23—27 |
| Праверка насення на ўсходжасць | 8—9, 12—14, 17, 18, 26, 27 |
| Абрэзка дрэў | 3—5, 27 |
| Прышчэпка | 17, 18 |

## Накрытая градка

**Пасля доўгай зімы большасць людзей зведвае вітамінны голад. Відаць, таму хочацца хутчэй сабраць першы ўраджай са свайго агарода. Істотную дапамогу ў гэтым акажуць прасцейшыя накрыванні градак поліэтыленавай плёнкай ці нятканым укрыўным матэрыялам спанбонд.**

Спанбонд валодае ўнікальнымі ўласцівасцямі: пад ім ствараюцца аптымальныя ўмовы для развіцця большасці агародных раслін, паскараецца іх рост, павышаецца агульная ўраджайнасць. Нятканы накрыўны матэрыял мае высокую святлопранікальнасць, у тым ліку і для ўльтрафіялетавых промняў. У гарачае надвор'е расліны пад ім не запарваюцца, не пераграваюцца і не атрымліваюць апёкаў. У халодныя дні ён не дапускае переахаладжэння раслін і здольны ахоўваць іх ад замаразкаў да мінус 7 градусаў. Паліваць свае градкі можаце не здымаючы спанбонду — матэрыял добра прапускае вільгаць. Пры вырошчванні зялёных культур (цыбулі на пяро, салатнай капусты, пятрушкі, кропу, радыскі) першы ўраджай можна атрымаць ужо ў пачатку мая, г. зн. на 2 тыдні раней, чым на адкрытых градках. Вельмі зручны гэты матэрыял пры вырошчванні ранняй белакачаннай капусты. Накрыўшы расаду адразу пасля высадкі яе на грады, уборку можна пачынаць ужо ў пачатку чэрвеня, і, што асабліва важна, качаны не пашкоджваюцца вусенямі капуснай бялянкі, таму што яны проста недаступныя для шкодніка. Раннія суніцы лёгка можна атрымаць, накрыўшы градкі нятканым матэрыялам. Ураджай спее на 15—20 дзён раней, чым у адкрытым грунце. Проста незаменны спанбонд пры вырошчванні цеплалюбівых культур — перцаў, памідораў, агуркоў. У адрозненне ад поліэтыленавай плёнкі ён не дапускае ні пераахалоджвання, ні перагрэву раслін і ў некаторай меры засцерагае таматы ад фітафтарозу, а агуркі ад мучністай расы. Вопытныя агароднікі сцвярджаюць, што таматы, якія накрываюцца спанбондам, вызначаюцца хуткім ростам, фарміруюць больш кветкавых лістоў.

## Вешанкі — гэта смачна

***«Хацелася б даведацца пра смакавыя і лекавыя ўласцівасці культываемых грыбоў, напрыклад вешанак. Як правільна іх вырошчваць у хатніх умовах?»***

**Мікалай ІВАНОЎ,** *Карэліцкі раён.*

Стравы, прыгатаваныя з грыбоў, любяць усе. І збіраць грыбы — вялікае задавальненне, але не ўсе могуць яго атрымаць. Не бядуйце, калі вы жывяце не ў лясістай мясцовасці ці па нейкай іншай прычыне не можаце збіраць грыбы ў лесе. Іх можна культываваць без асаблівых затрат, даволі проста і эфектыўна на прысядзібным участку, а на смак яны будуць не горшыя за славутыя шампіньёны. Гэта — вешанкі звычайныя. У вешанках, напрыклад, поліцукрыдаў у два разы больш, чым у лісічках, і ў чатыры разы больш, чым у культываемых шампіньёнах. Дзякуючы гэтаму вешанкі захоўваюць свой аб'ём пры кулінарнай апрацоўцы. Менавіта поліцукрыды вешанак, у прыватнасці іх глюканы, адказваюць за іх проціракавае дзеянне. Ва ўмераных дозах грыбная клятчатка вешанкі нармалізуе дзейнасць кішэчнай мікрафлоры.

Вешанкі растуць на нежывой драўніне лісцевых парод: асіны, бярозы, таполі і іншых. Расце гэты грыб букетам, у якім часта налічваецца да 30 грыбоў агульнай вагой 2—3 кілаграмы.

Для іх вырошчвання трэба нарыхтаваць адрэзкі ствалоў і сучкоў драўніны лісцевых парод дыяметрам не менш чым 15 см, даўжынёй 25—30 см. Больш тонкія адрэзкі даюць меншы ўраджай. Гэтыя грыбы развіваюцца ў вільготным асяроддзі, адрэзкі трэба на 1-2 дні апусціць у ваду.

Вырошчванне складаецца з двух этапаў. Першы этап — абрастанне адрэзкаў грыбніцай. У канцы зімы намоклыя адрэзкі трэба паставіць у падвал ці склеп або ў іншае закрытае памяшканне.



На кожны верхні старчак (тарэц) адрэзка наносіцца зерневая грыбніца слоем 1—2 см. На яе ставіцца другі адрэзак, і на верхні старчак наносіцца новая порцыя грыбніцы. Такую калону можна давесці да двух метраў. Умацуйце яе лепш. Расход грыбніцы — 70—100 грамаў на адзін адрэзак.

Зверху калону трэба накрыць саломай ці мешкавінай, але не плёнкай, якая не прапускае паветра.

Пры тэмпературы 10—15 градусаў цяпла драўніна зарастае грыбніцай на працягу 2—2,5 месяца. Пры сухім надвор'і памяшканне з грыбной плантацыяй неабходна ўвільгатняць, але, паліваючы, сачыце, каб вада не трапляла на адрэзкі. Другі этап — вырошчванне грыбоў. Адрэзкі, якія зараслі грыбніцай, «высаджваюць» у адкрыты грунт, заглыбляючы свабодны старчак адрэзка на 10—15 сантыметраў на адлегласці 30—35 сантыметраў. Грыбы з'яўляюцца звычайна ў жніўні—верасні. Пры першым зборы можна атрымаць да 600 грамаў грыбоў. Зімаваць адрэзкі пакідаюць на тым жа месцы. На другі і трэці год ураджай павінен дасягнуць 2—2,5 кг. Пасля трэцяга года ўсё пачынаецца спачатку: патрэбна новая грыбніца і новыя адрэзкі, калі старыя сталі мяккімі і спарахнелымі. Грыбніцу трэба заказваць вясной ці рана ўвосень.

*СЛУШНЫЯ ПАРАДЫ*

## Тэмпература глебы

«Калі сеяць?» — адказ на гэта пытанне ў многім залежыць ад ступені прагрэву глебы. Як жа памераць тэмпературу верхняга яе слоя? З гэтай мэтай зручна выкарыстаць звычайны акварыумны тэрмометр. Для гэтага ўкапайце на глыбіню каля 10 см слоік з вадой, накрыйце яго кавалкам фанеры і невялікім слоем зямлі, каб прадухіліць выпарэнне і нагрэў на сонцы. Цяпер вы можаце ў любы час апусціць у яго тэрмометр і даведацца аб прыкладнай тэмпературы глебы на сваім участку. Каб быць больш дакладным, не перашкодзіць мець некалькі такіх кантрольных ёмістасцяў у розных пунктах агарода. Пры разавай неабходнасці можна абысціся і звычайным тэрмометрам, укладваючы яго цалкам у зямлю на такую ж глыбіню.

## Дачныя падказкі

Частая памылка пры вырошчванні расады гарбузовых культур — спроба яе перасаджваць. Расаду гарбузовых вырошчваюць без пікіроўкі, толькі ў гаршчочках. Насенне лепш высяваць прарошчанае: за 20—25 дзён да высадкі ў адкрыты грунт высяваць агуркі, за 18—20 дзён — кабачкі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 686. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12